незалежная газета

№ 6 (604) 11 лютага 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. АднОўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Пасол Расіі палез упярод Бацькі ў пекла**

Старонка 3

**Калі табе чатырнаццаць**

Старонка 12




**Гісторыя: вайсковыя фармаванні БНР**

Старонка 9

## У НУМАРЫ

**У Беларусі таксама можна ганіць Абаму**

У Мінску адбыўся круглы стол з удзелам прадстаўнікоў лукашэнкаўскіх і недзяржаўных СМІ — сярод іх былі Зімоўскі, Літвіна, Сярэдзіч, Якубовіч, — а таксама Пяткевіч і еўрапейскіх дыпламатаў. **Старонка 5.**

**Іван Шыла будзе служыць з Аляксандрам Лукашэнкам**

**Старонка 4.**

**Гісторыя аднаго размеркавання**

Журналіст прасачыў траекторыю маладога спецыяліста. **Старонка 10.**

**Прыма Купалаўскага Ганна Хітрык абвясціла вайну папсе**

«Людзі не дурныя, проста прывыклі», кажа яна. **Старонка 11.**

**Падтрымаем беларускага настаўніка**

Рэйд па школах Мінску. **Старонка 13.**

**Віктар Шалкевіч**

Народжанаму быць у дарозе — 50. **Старонка 14.**

**Праграма незалежнага тэлеканалу «Белсат»**

на тыдзень. **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — старонка 2.

# Паляць, падрываюць, дэстабілізуюць

На пагаршэнне эканамічнай сітуацыі лукашэнкаўцы адрэагавалі тонка зрэжысіраванай прапагандысцкай кампаніяй.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Раніцай 8 лютага мінскае спецпадраздзяленне па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз» правяло ператрусы і арышты на кватэрах былых палітвязняў Мікалая Аўтуховіча і Юрыя Лявонава, а таксама іхняга паплечніка Уладзіміра Асіпенкі.

Вобшукі адбыліся яшчэ ў некалькіх ваўкавыскіх сем'ях, звязаных з рухам апазіцыі. Прынамсі, дома ў дэпутата Вярхоўнага Савету XII склікання (1990—1995) Мікалая Аксаміта забралі агітацыйныя матэрыялы з апошняй прэзідэнцкай кампаніі, газеты, два бел-чырвона-белыя сцягі. Маўляў, па справе ліпеньскага выбуху. Хоць Аксаміт ужо некалькі гадоў як працуе за мяжой.

Шманалі ўсіх, хто хоць неяк мог быць звязаны з Аўтуховічам.

«Алмазаўцы» мінашукальнікам праверылі не толькі хаты, але і агароды, дачы. Адбыўся ператрус і на офісе фірмы «Ніка-таксі 22222», заснавальнікам якой некалі быў Аўтуховіч, а па вызваленні працаваў там звычайным кіроўцам. Шукалі зброю, а таксама ўсё, што можа быць звязанае з выбухоўкай. Дома ў Лявонава сканфіскавалі волава і паяльнік. У Аўтуховіча сканфіскавалі кампутар і асабістыя запісы. Арыштаваных адвезлі ў ізалятар часовага ўтрымання ў Мінск.

Вечарам таго ж дня пра затрыманне паведаміла Беларускае тэлебачанне. Вядоўца аналітычнай «Панарамы тыдня» Юры Пракопаў са спасылкай на прэсслужбу МУС паведаміў, што затрыманая група жыхароў Ваўкавыску, якія падазраюцца ў арганізацыі і здзяйсненні шэрагу цяжкіх злачынстваў.

У прыватнасці, было сказана пра падпалы і падрывы маёмасці дзяржаўных службоўцаў. Такім чынам яны выказвалі нязгоду з несправядлівымі, з іх меркавання, рашэннямі гарадскіх уладаў адносна іхняй фірмы. БТ паведаміла, што пры ператрусах у кватэрах арыштаваных была знойдзена выбухоўка і агнястрэльная зброя. Сваякі затрыманых гэта не пацвярджаюць.

Супраць арыштаваных высунутае абвінавачанне па артыкуле 218 частка 2 КК «Наўмыснае знішчэнне альбо пашкоджанне маёмасці, якое прывяло да значных стратаў». Санкцыі паводле артыкулу — ад 3 да 10 гадоў.

Паводле звестак былога следчага, праваабаронцы Алега Воўчака, у 2004 годзе ў Ваўкавыску насамрэч быў здзейснены падпал прыватнага дому начальніка мясцовага РУУС падпалкоўніка Віталя Кацубы. Цяпер той сп.Кацуба працуе дырэктарам мясцовай друкарні.

Падчас сустрэчы з дочкамі Лявонава і Асіпенкі Кацуба сказаў, што не падаваў ніякіх заяваў у міліцыю і не разумее прычын арышту, бо за падпал у турме ўжо адбывае пакаранне іншы чалавек.

Тая самая сітуацыя з былым падатковым інспектарам Мандзікам, у якога ў 2005 годзе падпалілі дом, гараж і аўтамабіль. Але і па ягонай справе ёсць асуджаны, і ніякіх дадатковых заяваў у міліцыю ён не падаваў.

**Працяг на старонцы 3.**

# МВФ навязвае Украіне жорсткую дысцыпліну

**Міжнародны валютны фонд найхутчэй што прыпыніць выплату чарговай траншы стабілізацыйнага крэдыту Украіне. Урад Цімашэнкі гатовы ў такім выпадку пайсці на збліжэнне з Масквой узамен за 5-мільярдны крэдыт.**

Адпаведную просьбу Ю.Цімашэнка ўжо накіравала расійскаму ўраду. Яе крок выклікаў рэзкую крытыку з боку прэзідэнта Віктара Юшчанкі.

Украіна не выконвае ўмоваў крэдытнага пагаднення, заключанага з МВФ і мае мала шанцаў атрымаць наступную траншу, паведамляюць СМІ са спасылкай на крыніцы ў дэлегацыі Фонду ў Кіеве. Гаворка аб прыняцці ўрадам нерэалістычнага бюджэту на 2009 год, які прывядзе да гіганцкага бюджэтнага дэфіцыту.

Украіна, залежная ад попыту на метал і ўгнаенні на сусветным рынку, найцяжэй перажывае эканамічны крызіс.

Сітуацыя пагаршаецца праз бясконцыя спрэчкі між фінансавымі групоўкамі і палітычнымі сіламі, якія іх прэзентуюць. Каб утрымацца на краі прорвы, Кіеў пайшоў з шапкай. Летась яму ўдалося дамовіцца пра выдзяленне $16,4 млрд крэдыту ад МВФ. Аднак і гэтых грошай не стае. Таму Цімашэнка распачала перамовы ў Маскве пра выдзяленне $5 млрд на пакрыццё бюджэтнага дэфіцыту.

Дэлегацыя выправілася ў Расію таемна, але інфармацыю аб перамовах выведалі журналісты.

Прэм'ер-міністарка Украіны Юлія Цімашэнка ў сваё апраўданне паведаміла, што Украіна звярнулася па дапамогу адначасова да ЗША, ЕС, Кітаю і Японіі і што «пра сваю гатоўнасць падпісаць крэдытнае пагадненне заявіла Расія». Цімашэнка не можа не ведаць, што заходнія краіны, як правіла, не дапамагаюць фінансава напрост. Эканамічная дапамога — справа міжнародных фінансавых інстытутаў, такіх як Валютны фонд ці Сусветны банк. Між тым Масква ахвотна вылучае дзяржаўныя пазыкі ўзамен за палітычныя паслугі. $2 млрд атрымала за апошнія паўгоду Беларусь, яшчэ больш паабяцана Кіргізіі за закрыццё амерыканскай базы «Манас», $0,5 млрд выдзелена малесенькай Арменіі.



На думку Юшчанкі, перамовы з Масквой — «гэта небяспечная палітыка, якая стварае пагрозу нацыянальным інтарэсам Украіны».

Першую траншу крэдыту МВФ памерам $4,5 млрд Украіна атрымала ў лістападзе, атрыманне наступных было пастаўлена ў залежнасць ад скарачэння дэфіцыту бюджэту.

**Мікола Бугай**

### «Жаўнеры БНР» праедуць па краіне

14—17 лютага ў розных гарадах краіны пройдзе шэраг прэзентацый новае кнігі выдатнага сучаснага гісторыка, праф. Алега Латышонка «Жаўнеры БНР» з удзелам аўтара. Гэта вычарпальны збор працаў, прысвечаных незалежніцкім вайсковым фармаванням 1917 —1924 гадоў. Частка сустрэчаў пэўная, частка — на стадыі ўзгаднення. Калі ласка, сачыце за абвесткамі ў інтэрнэце і распытвайцеся ў мясцовых супольнасцях.

**14 лютага, субота** — прэзентацыя ў рамках канферэнцыі «Эдвард Вайніловіч — зямянін, грамадзянін, каталік». . Мінск, бібліятэка Адама Міцкевіча ў дольнай частцы касьцёлу Святых Сымона і Алены. 09.00—12.30

**14 лютага, субота — прэзентацыя ў Магілёве.** Цэнтр «Кола» 18.00

**15 лютага, нядзеля — прэзентацыя ў Віцебску.** Кавярня «Залатое цяля», вул.Беларуская, 6а (насупраць аўтавакзалу). 13.00

**15 лютага, нядзеля — прэзентацыя ў Глыбокім.** Касцёл Святой Тройцы, 19.00

**16 лютага, панядзелак — Мінск, Гістарычная майстэрня**, вул.Сухая, 25, 18.00

**17 лютага — Гродна**, заля Таварыства беларускай школы, вул.Будзённага, 18.30

Заплянаваная таксама **сустрэча ў Наваполацку**. Даведкі па тэл. (8-029) 550-79-69.

**Падрабязней пра кнігу — старонка 9.**

## СЦІСЛА

### Рублёвыя ўклады скараціліся на 14%

У студзені ўклады насельніцтва ў беларускіх рублях скараціліся на 13,8% і на 1 лютага склалі прыблізна 6,7 трлн. рублёў. Дэпазіты ў замежнай валюце, наадварот, павялічыліся на 11,6% — у эквіваленце 2,8 млрд. даляраў. Людзі пераводзяць свае рублёвыя ўклады ў інвалютныя, зважаючы на рост курсу даляра.

### На «Інтэграле» будуць выпускаць ноўтбукі

Тэхнічныя характарыстыкі айчыннага ноўтбука не будуць адрозніваца ад імпартных аналагаў, зазначылі спецыялісты. У беларускім ноўтбуку будзе выкарыстоўвацца матрыца 15,1 цалі.

### Выстава Марачкіна ў Нью-Йорку

У нядзелю 15 лютага ў Нью-Йорку ў Беларускім музеі (401 Atlantic Ave., Brooklyn, N.Y.) — адкрыццё персанальнай выставы Аляксея Марачкіна і сустрэча з самім мастаком. Пачатак а 12.30.

**СМ; паводле ўл.інф., радыё «Свабода», Белапан, БЕЛТА**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічаюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Віктару А.** з Магілёва.
**А.Б.** з Ваўкавыску.
**Мікалаю Б.** з Нараўлянскага раёну.
**Валянціне К., А.К.** з Віцебскага раёну.
**В.С.** з Бабруйскага раёну.
**Сяргею В., Аляксандру П., Руслану К., Мікалаю К., Мікалаю Ч., Сцяпану Н., Лявонцію А., Міхаілу Б., Андрэю Н., Андрэю Г., Валерыю К., Сяргею В.** з Полацкага раёну.
**В.Б., В.Х., Паўлу Д., Паўлу Д., Барысу С.** з Светлагорскага раёну.

# МЗС рэкамендавала паслу Расіі не лезці паперад Бацькі ў пекла

**Цягам мінулага тыдня высокім чыноўнікам неаднаразова даводзілася абвяргаць інфармацыю, што беларускія хлопцы будуць служыць у гарачых кропках, пра ўвод адзінай валюты саюзнай дзяржавы, а таксама аб будаўніцтве Астравецкай АЭС на расійскія грошы.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Ужо на наступны дзень па вяртанні Лукашэнкі ў Мінск з паседжанняў найвышэйшае дзяржрады Беларусі і Расіі, а таксама саміту АДКБ беларускія чыноўнікі выступілі з цэлым шэрагам абвяржэнняў, як выказаўся міністр замежных справаў Сяргей Мартынаў, «некарэктных інтэрпрэтацый няўважлівых журналістаў асобных СМІ».

«Удзел Беларусі ў Калектыўных сілах аператыўнага рэагавання АДКБ не прадугледжвае ўдзелу беларускіх салдатаў у якіх-небудзь ваенных канфліктах за межамі Беларусі», — было адразу заяўлена ананімным прадстаўніком беларускай дэлегацыі ў Маскве.

Гэтую заяву «крыніцы» імгненна растыражавалі БЕЛТА і ўсе дзяржаўныя СМІ, што можа быць сведчаннем непапулярнасці ў беларускім грамадстве ідэй абароннай інтэграцыі з нестабільнымі краінамі былога СССР. Відавочна, улады баяліся негатыўнай рэакцыі на чарговы крок, які ўцягвае Беларусь у арбіту расійскіх інтарэсаў.

Аналагічныя абвяржэнні прагучалі і адносна пераходу на адзіную валюту і фінансавых пагадненняў, якія, у сваю чаргу, ставяць пад сумнеў нечуваны эканамічны поспех беларускай мадэлі. Міністр замежных справаў Сяргей Мартынаў заявіў, што гаворка вялася толькі пра ўвядзенне расійскага рубля як рэгіянальнай валюты.

У пятніцу ў Мінску прэс-канферэнцыю даваў пасол Расіі Аляксандр Сурыкаў, які выказаўся па некаторых актуальных пытаннях «саюзнай дзяржавы».

У прыватнасці, ён не выключыў магчымасці ўдзелу беларускіх вайскоўцаў у аперацыях у рамках АДКБ за межамі Беларусі. «Частка сілаў аператыўнага рэагавання на выклікі тэрарызму, наркатрафіку будзе сфармавана і ў Беларусі. Міжнарадавыя пагадненні стаяць усё ж вышэй за заканадаўства асобных краін», — сказаў А.Сурыкаў.

> **Расія сутыкнулася з самай жорсткай дыпламатычнай рэакцыяй Мінску за апошнія гады.**

Цана на прыродны газ у першым квартале 2009 г. для Беларусі складзе трохі больш за $200 за 1000 кубоў, сказаў ён. Сярэднегадавая цана будзе складаць блізу $150, яна будзе залежыць ад пераразлікаў цэнаў на нафту. У беларускім бюджэце на сёлета цана на газ закладзена ў памеры $148 за 1000 кубаметраў.

Будаўніцтва Астравецкай АЭС будзе здзяйсняцца за кошт расійскага крэдытавання, паведаміў дыпламат. «Расія пойдзе на максімальна выгадныя для Беларусі ўмовы», — сказаў А.Сурыкаў. З яго слоў, кошт будаўніцтва АЭС складзе прыкладна $3—5 млрд.

Вечарам таго ж дня прэс-сакратар МЗС Андрэй Папоў распаўсюдзіў рэакцыю беларускага боку на заявы расійскага дыпламата. Ён падкрэсліў, што беларускія вайскоўцы ў баявых дзеяннях за межамі Беларусі не ўдзельнічалі і не будуць удзельнічаць — гэта забаронена айчынным заканадаўствам.

«Па-першае, адразу хачу падкрэсліць, што ўжо дакладна не паслы іншых дзяржаваў будуць «разбірацца» ў адпаведных нюансах беларускага заканадаўства», — заявіў А.Папоў. Гэта была самая жорсткая дыпламатычная рэакцыя Беларусі на выказванні расійскага дапламата ад часу адмовы прыняць пасла Аяцкава. — «Ёсць закон нашай краіны, і ён будзе няўхільна выконвацца. Дый згаданы дакумент АДКБ, дарэчы, пакуль не мае статусу міжнароднага пагаднення. Акрамя таго, трэба мець на ўвазе, што рашэнні аб задзейнічанні КСАР будуць прымацца толькі кіраўнікамі дзяржаваў АДКБ і толькі на аснове кансэнсусу. Так што не трэба паслу забягаць наперад. Таксама як не трэба яму спяшацца апяраджваць вынікі выканання даручэнняў ВДС і па такіх тэмах беларуска-расійскага ўзаемадзеяння, як удзел Расіі ў будаўніцтве беларускай АЭС», — сказаў А.Папоў.

Паспешлівасць, з якой лукашэнкаўцы адхрышчваюцца ад таго, што падаецца Масквой як адбытыя факты і пад чым стаяць подпісы кіраўніка беларускай дзяржавы, тлумачыцца таксама бояззю, што занадта адданы ўдзел у амбітных планах Масквы па выдушванні Захаду з постсавецкай прасторы можа каштаваць беларускім уладам так патрэбных ім крэдытаў, без якіх не ўдасца ўтрымаць дабрабыт людзей хоць на цяперашнім узроўні.

**Зміцер Панкавец**

# Паляць, падрываюць, дэстабілізуюць

**Працяг са старонкі 1.**

Звярнула ўвагу, што літаральна за некалькі дзён да «шмону» ў Ваўкавыску на шырокае грамадскае абмеркаванне быў выцягнуты выпадак у палескай вёсачцы Пухавічы, калі тры мясцовыя жыхары забілі да смерці падпальшчыка дамоў. Выпадку надалі надзвычайную ўвагу дзяржаўныя СМІ, па гэтую ж тэму выказаўся асабіста Лукашэнка, які папрасіў старшыню Вярхоўнага Суду Валянціна Сукалу паставіцца да забойцаў «як да родных людзей», а таксама вызваліць да суду з турмы.

Супадзенне ў часе звязвае ў свядомасці людзей падпалы дамоў і апазіцыю. Падобна як затрыманні іншадумцаў у ліпені асацыяваліся з крывавым тэрактам па канцэрце.

На стан 10 лютага ўсе арыштаваныя працягваюць знаходзіцца за кратамі, да іх не пусцілі адвакатаў. Справу будзе весці следчы Кухарчык з Гродзенскай абласной міліцыі. Невядома толькі, для чаго ваўкавысцаў перавезлі ў Мінск.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Аўтуховіч — сапраўды чалавек крутога нораву. Ён некалькі гадоў супрацьстаяў мясцовым уладам, якія, як ён лічыў, спрабавалі задушыць яго бізнес. У 2004 годзе ён балатаваўся ў парламент як незалежны кандыдат па Ваўкавыскай акрузе. Паводле незалежнага экзіт-полу ён перамагаў, вынік падліку галасоў выбарчай камісіяй аказаўся іншым. Урэшце 7 ліпеня 2006 г. былога афганца, уладальніка фірмы прыватнага таксі Мікалая Аўтуховіча зняволілі на тры з паловай гады, абвінаваціўшы ў няўплаце падаткаў у асабліва буйным памеры. Ягонаму калегу Юр'ю Лявонаву далі толькі на месяц менш. Міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі яны былі прызнаныя вязнямі сумлення, а на волю выйшлі датэрмінова — у студзені 2008 году, пад ціскам ЕС.

Падчас следства Аўтуховіч праводзіў шэраг галадовак. За час рэкорднай 74-дзённай галадоўкі палітвязень страціў больш за 40 кілаграмаў. Прадпрымальнік уцякаў з-пад хатняга арышту, але не з'ехаў з краіны, таму праз нейкі час міліцыя знайшла яго ў Мінску.

Паплечнікі адзначаюць, што турма не зламала Аўтуховіча. Пасля выхаду ён пачаў пацыху аднаўляць свой бізнес, не спыніў грамадскай дзейнасці. Паводле некаторай інфармацыі, Аўтуховіч планаваў негвалтоўныя акцыі пратэсту супраць пэўных дзеянняў гарадскіх уладаў.

У памежным з Еўрасаюзам Ваўкавыску Мікалай Аўтуховіч захоўваў высокі аўтарытэт чалавека, які змагаўся з несправядлівасцю.

**ЗП**

**Справа Аўтуховіча**

Мікола Аўтуховіч — ваўкавыскі прадпрымальнік, былы афганец. Быў гаспадаром фірмы прыватнага таксі «Ніка-транс». У 2004 годзе балатаваўся ў парламент як незалежны кандыдат па Ваўкавыскай акрузе. Паводле незалежнага экзіт-полу перамагаў, вынік падліку галасоў выбарчай камісіяй аказаўся іншым. 7 ліпеня 2006 М.Аўтуховіча зняволілі на 3,5 гады, абвінаваціўшы ў няспалце падаткаў у асабліва буйным памеры. Яго калегу Юр'ю Лявонаву далі на месяц менш. Міжнародныя праваабарончыя арганізацыі прызналі іх вязнямі сумлення. У няволі Аўтуховіч абвяшчаў галадоўкі ў знак пратэсту. Самая працяглая доўжылася 74 дні, вязень страціў 40 кг вагі. На волю выйшлі датэрмінова — у студзені 2008 году, пад ціскам ЕС.

# Іван Шыла будзе служыць з Аляксандрам Лукашэнкам

**Лідэр салігорскай моладзі Іван Шыла 7 лютага прыняў вайсковую прысягу. Да яго ў частку ў дзень прысягі прыехала блізу трыццаці сяброў і паплечнікаў.**

З усіх трох палітычных навабранцаў зімовага прызыву-2009 Івана Шылу закінулі ў самую цяжкадаступную з Мінску вайсковую частку — што ў вёсцы Межыца. Каб туды дабрацца, трэба ехаць віцебскай трасай да Лепелю, там павярнуць на Оршу, дабірацца да вёсачкі Заслонава, дзе месціцца яшчэ адна вайсковая частка (з якой, дарэчы, нядаўна дэмабілізаваўся перакладчык «Байцоўскага клубу» Сяржук Мядзведзеў).

За пяць кіламетраў на поўнач ад Заслонава і стаіць Шылава 29-я зенітна-ракетная брыгада. Гэта самая мяжа Лепельскага і Чашніцкага раёнаў. Мясціны глухія і маланаселеныя. Ад сталіцы 175 кіламетраў.

У Межыцы вы адразу пабачыце доўгі бетонны плот — гэта і ёсць вайсковая частка. Людзей на прысягу прыехала вельмі многа, утварылася ці не кіламетровая чарга машын. Напярэдадні палохалі, што будуць пускаць толькі па чатыры чалавекі да кожнага прызыўніка. А да аднаго толькі Шылы прыехала трыццаць. Аднак пусцілі ўсіх. Салдат на КПП доўга ўглядаўся ў важкі том гістарычных твораў Юр'я Туронка і іншыя кніжкі, прывезеныя Івану сябрамі, але ўрэшце даў дабро пранесці іх у частку.

Прыехалі Іванавы бацькі, дзяўчына, паплечнікі па «Маладым фронце» з Мінску і Салігорску, праваабаронцы. Дзень прысягі — першая магчымасць паразмаўляць з хлопцам, раней сваякоў у часткі не пускаюць.

Дый ніхто і не ведаў, ці будзе гвалтоўна забраны ў войска Іван прымаць прысягу. Мо адмовіцца, як Зміцер Жалезнічэнка? На пляцы, сярод дзесяткаў падобных навабранцаў заўважыць Івана было цяжка. Многія разглядзелі яго, толькі калі ён пачаў прамаўляць: «Я, грамадзянін Рэспублікі Беларусь...»

Шыла прысягаў апошнім з свайго падраздзялення. Перад ім прымаў прысягу прызыўнік Аляксандр Аляксандравіч Лукашэнка.

Адразу вярнуцца ў шраг пасля прысягі Івана не далі. Афіцэры нешта яму доўга расказвалі, відавочна, спрабавалі падбадзёрыць. Было бачна, што страявая ў хлопца яшчэ не дасканалая. Вядома ж, прабыў у частцы менш за два тыдні.

А потым салдатам далі чатыры гадзіны вольнага часу: пабыць з сваякамі і сябрамі. Шыла застаўся верны сабе — мінімум эмоцый і словаў. Нават усмешку на ягоным твары злавіць было досыць складана. Усё такі ж задумены, сканцэнтраваны, толькі паголены налыса і ў вайсковай форме.

Пабачыўшы меншага брата Іллю, гукнуў: «Гэй, гэта ж мае красачы». «У цябе цяпер не красачы, а кірзачы на паўтара году», — імгненна адрэагаваў брат.

Пасля прысягі да бацькоў падышоў высокі палкоўнік з Мінску, пачаў супакойваць іх, казаць, што з Іванам усё будзе добра. Стараўся гаварыць па-беларуску. Ставіў у прыклад былога лідэра «Моладзі БНФ» Алеся Каліту, якога назваў найлепшым салдатам часткі.

Праз колькі хвілінаў выйшаў і сам Алесь. За паўгоду службы Каліта добра так вымахаў у плячах. У 20-х днях лютага яму павінны даць лычкі малодшага сяржанта. Хлопец размаўляе з салдатамі і афіцэрамі па-беларуску. Пра службу Каліта адгукаўся толькі станоўча.

Іван кажа, што ў санчасцы (трапіў з ангінай) займаў час тым, што чытаў часопіс «Нёман», які ідзе ў вайсковыя часткі па падпісцы, «Советскую Белоруссию», «Белорусскую военную газету». Усе выданні багата месца вылучаюць апазіцыі. Каліта ж, напрыклад, выпісвае ў частку «Нашу Ніву», ніякіх праблем з гэтым няма.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Шыла выклікае ўсеагульную цікавасць.**

Шыла пісаў дзённік, а таксама лісты. Кажа, у санчасцы нагледзеўся, што ў войска прызываюць хлопцаў з самымі рознымі захворваннямі. Афіцэры ўгаворваюць іх прыняць прысягу, а накіраваць на пераабследаванне абяцаюць потым. Івана таксама ўгаварылі прысягнуць, паабяцаўшы ў маі адпачынак, каб здаў школьныя экзамены.

У частку салігорца везлі ў кайданках. У тым самым мікрааўтобусе ехала здымачная група БТ. Была яна і на прысязе. Таксама былі дзіўныя людзі ў цывільным, якія адварочваліся ад фотакамер. «Думаў, што хоць у войску не будзе такіх, але ж і тут во ёсць», — смяецца Іван.

Ад панядзелка пачнуцца нарады. Увогуле, Шыла не скардзіўся на ўмовы, хіба толькі зазначыў, што рэдка водзяць у лазню. Зрэшты, да патрабаванняў таксама прыслухоўваюцца. У рацыёне сталовай быў сок, але яго не давалі. Варта было толькі закрануць гэтае пытанне, як сок на сталах з'явіўся.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Да Янкі прыехала дзяўчына Хрысціна.**

Неафіцыйны пасыл ад афіцэраў да Шылы таксама быў простым: «Ты не ствараеш нам праблемаў, мы не ствараем табе». Кажа, з ім адзіным афіцэры не размаўляюць матамі. Праблема «дзедаўшчыны» для часткі таксама не актуальная.

Расказвае, што таварышы па службе абсалютна не ведаюць гісторыі з ягоным прызывам, нічога не ведаюць і пра апазіцыю. Да яго беларускай мовы ставяцца досыць станоўча. «Хапае і такіх, чыя натуральная мова вельмі набліжаная да літаратурнай беларускай, але яны на маю беларускую рэагуюць найбольш негатыўна», — кажа салдат. З 147 навабранцаў толькі трое маюць вышэйшую адукацыю. Большасць — вясковыя хлопцы.

Па тэлефоне Іван абмяняўся першымі ўражаннямі ад вайсковай службы з іншымі палітпрызыўнікамі — Франакам Вячоркам і Змітром Хведаруком. Найбліжэйшая задача — налаўчыцца завязваць анучы і падшываць каўнерыкі.

Адведзены для спатканняў час выйшаў. За вонкавым Іванавым спакоем хаваўся сум. Да дэмбелю засталося 528 дзён.

**Зміцер Панкавец, Межыца—Мінск**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У гэтай жа частцы ўжо паўгоду служыць лідэр «Моладзі БНФ» Алесь Каліта. Камандзіры яго называюць няйначай як «найлепшым байцом» і «прыкладам для астатніх салдат». На фота ён трэці злева.**

Лукашэнка звярнуўся да міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава з загадам: «Калі ласка, заўтра Вы іх адвязіце ў вёску, я Вас прашу, няхай яны жывуць у вёсцы, а Вы вядзіце сваю крымінальную справу, — гэта пра трох палешукоў, якія лінчавалі ашалелага катаржніка, які не даваў спакою вёсцы. — Адвязіце людзей у вёску, і няхай працуюць там, знаходзяцца ў сваіх сем'ях, а Вы іх запрашайце і дапытвайце, гэта для іх будзе лепш, чым сядзець у следчым ізалятары».

У той жа дзень абвінавачваных прывезлі з СІЗА ў роднае сяло Пухавічы Жыткавіцкага раёну.

Звяртаючыся да старшыні Вярхоўнага Суду Валянціна Сукалы, Лукашэнка ўказаў: «Я папрасіў бы, каб Вы лаяльна вялі гэтую крымінальную справу. І вельмі Вас прашу, пастаўцеся як да сваіх родных людзей. Ну нягоднік ён, людзей тэрарызаваў, цэлую вёску. Калі ўжо мужыкі на гэта пайшлі, напэўна, яны сапраўды абураныя былі, і ўсё ж простыя людзі на іх баку. Калі трэба прыняць рашэнне ў рамках заканадаўства, я гатовы прыняць, але мне падаецца, Вы без мяне там прымеце рашэнне. Гэтых людзей трэба адпусціць, весці следства, няхай гэтае следства ідзе. І нават прашу публічна, не саромеючыся, суд, каб вы вельмі ўважліва паставіліся, і калі ёсць магчымасць, падтрымалі гэтых людзей. Нельга іх саджаць! Што гэта — вялікі чалавек загінуў? Па турмах туляўся, прыйшоў і яшчэ тэрарызуе цэлую вёску».



# «Адвязіце іх у вёску»

Лукашэнка пазіцыянуе сябе як цара і тым самым падрывае асновы павагі да закону. Піша **Барыс Тумар**.

У «Кнігарні «Наша Ніва» сёлета мае выйсці манаграфія прафесара Анджэя Сулімы Камінськага «Рэспубліка супраць аўтакратыі: Рэч Паспалітая і Расія, 1686—1697». Аўтар вывучаў дыпламатычныя кантакты паміж краінамі ў перыяд, калі Расія ўваходзіла ў сілу, пачаўшы эксплуатацыю гіганцкіх калоній Сібіры і Уралу, а Рэч Паспалітая перажывала заняпад. Але нават ад тых часоў сілы дзяржаўнага ладу краіны і адданасці яму нашых продкаў яшчэ хопіць, каб РП пратрымалася яшчэ цэлае стагоддзе. Я згадаў пра гэтую кнігу, калі прачытаў аб прыгожым жэсце, зробленым Аляксандрам Лукашэнкам 6 лютага на нарадзе па ўдасканаленні крымінальнага заканадаўства.

Файная папулісцкая інсцэнізацыя перад тэлекамерамі. Сарказі таксама папуліст, але немагчыма ўявіць сабе такі жэст у ягоным выкананні, ці нават у Буша, хоць той паходзіць у францію, на якім суды лінчу колісь былі дазволеныя заканадаўствам. У дэмакратычных краінах судовая ўлада незалежная ад выканаўчай. Гэта закон.

Манарх, якога стагоддзямі прызнавалі беларусы і якому былі верныя, — кароль Рэчы Паспалітай — не мог сваёй воляй пакараць самага дэградаванага грамадзяніна. Закон не дазваляў. Грамадзянаў — імі на той час была шляхта, якая складала 10 працэнтаў насельніцтва краіны — мог пакараць толькі адпаведны суд.

Мілавацца кароль мог і карыстаўся гэтым правам — але толькі пасля рашэння суду.

З дзяржаваю атаесамляліся грамадзяне, а не кароль, якога яны абіралі. «Дзяржава — гэта мы», — лічылі грамадзяне, і адпаведна дзейнічалі, і дзякуючы гэтаму Рэч Паспалітая была ўтварэннем, якое пратрымалася шмат стагоддзяў сярод мацнейшых і агрэсіўных суседзяў.

Зусім інакшым быў інстытут маскоўскага цара. Тут ужо ніякага «мы», акрамя «мы, цар Вялікія і Малыя і Белыя...». «Дзяржава — гэта я». Больш за тое, у адрозненне, скажам, ад караля-сонца Людовіка XIV, цару належала не толькі заканадаўчая і выканаўчая ўлада, а і судовая, ды яшчэ і сакральная роля.

Характэрнай рысай царскае сістэмы было тое, што менавіта цар меў манаполію на ажыццяўленне правасуддзя, і Суліма Камінськi бліскуча апісвае, як гэта функцыянавала і што з гэтага вынікала.

Як прадэманстраваў іншы гісторык, Эдвард Кінан, расійскім чыноўнікам забаронена было згадваць неўраджаі ці эпідэміі, бо гэта магло пашкодзіць царскай рэпутацыі. («Крызісу ў нас няма».) Забаранялася прызнаваць ваенныя паразы ці памылкі ўраду, бо пад началам цара не бывае памылак. У выніку Расія трапляла ў бясконцае кола хлусні (якое ў наш час называецца статыстыкай і рэйтынгамі).

Самасуд на Палессі адбыўся ад таго, што слабыя структуры самаўхіляюцца, бяздзейнічаюць, працуюць неэфектыўна, — хто з нас з тым не сутыкаўся — перадусім праз дысфункцыянальнасць сістэмы, у якой аператыўныя работнікі задыхаюцца ад перагрузкі пры адначасовай раздзьмутасці апарату палітычнага вышуку. Адбыўся таксама праз хібы ў законах, якія не дазваляюць ізаляваць тыпаў, як жыткавіцкі падпальшчык. І праз жахлівую сацыяльную дэградацыю рабскае вёскі.

**Прэзідэнт можа памілаваць — але толькі пасля таго, як вынес сваё рашэнне незалежны суд.**

Беларускі цар таксама мілуе і карае. У цара можна дабіцца справядлівасці. Цар — бацька. Калі што не так, то цар проста пра гэта не ведае. Цар ніколі не памыляецца. Ён бездакорны. Вось які вобраз ствараюць Лукашэнку. Народны цар, «адзін з нас, вынесены наверх», заступнік простага чалавека («простыя людзі на іх баку»).

Архетып цара актыўна выкарыстоўваўся і выкарыстоўваецца Лукашэнкам пры рэалізацыі ягоных паліттэхналагічных схемаў. «Вы ў нас трошкі большы чым Бог», — калісьці трапна схапіў гэта берасцейскі ваявода. Сама выбраная мянушка «Бацька» адсылае як да падняпроўскіх казацкіх атаманаў, так і да цара-бацюхны, айца народу.

Як і цара, «Кіраўніка дзяржавы» не дазволена крытыкаваць нават у малым. Ва ўсіх могуць быць «недочёты» — у Адміністрацыі прэзідэнта, у міністраў, у генералаў — але не ў цара.

Ну і як жа вялікі цар можа гаварыць на мове малое нацыі? Не па чэсці...

Прэзідэнт можа памілаваць — але толькі пасля таго, як вынес сваё рашэнне незалежны суд. Так дзейнічае еўрапейскае правасуддзе. Пакуль будзе інакш, Беларусь будзе заставацца краінай тыранічнай.

Самадзяржаўе Лукашэнкі — ужо не проста імідж. На сёння Лукашэнка дэ-факта трымае ў сваіх руках заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўладу. Фармальна замацаваны ў Канстытуцыі падзел уладаў не рэалізуецца на практыцы.

Які з яго «еўрапейскі лідэр» пры такім стаўленні да права і нацыянальнае мовы, пры адсутнасці падзелу уладаў?

Спагада моцным хлопцам з-над Прыпяці не павінна засланяць ад нас абсалютную заганнасць аўтакратычных прыёмаў з гледзішча праўнай дзяржавы.

Патрэба мець у дзяржаве моцную, г.зн. эфектыўную ўладу і падмацоўваць яе палітычнай папулярнасцю не дае права правам пагарджаць.

Як палітычны інстытут, кароль Рэчы Паспалітай быў «слабейшы» за расійскага цара. Аднак звярніце ўвагу, што ніводзін кароль і ніводзін ягоны нашчадак не былі забітыя, не скончылі сваіх дзён у турме. Іх часам выганялі, пераабіралі, але не забівалі і не садзілі ў турму. У Расіі цароў труцілі, душылі, забівалі, памяшчалі ў манастыр, самі цары забівалі сваіх дзяцей — патэнцыйных змоўшчыкаў. Абсалютная цана абсалютнай улады.

Хачу звярнуць увагу, што царская форма ўлады была ўласціва расійскай тыраніі, але не Беларусі з яе традыцыямі, з аднаго боку, ВКЛаўскага рэспубліканізму, а з другога, алігархіі. Прышчапляць царызм нашай краіне — азначае палітычна і ментальна русіфікаваць.

# У Беларусі таксама можна ганіць Абаму

У Мінску адбыўся круглы стол з удзелам прадстаўнікоў лукашэнкаўскіх і недзяржаўных СМІ — сярод іх былі Зімоўскі, Літвіна, Сярэдзіч, Якубовіч, — а таксама Пяткевіч і еўрапейскіх дыпламатаў.

«Ніводнаму сродку масавай інфармацыі ў Беларусі не было адмоўлена ў рэгістрацыі», — заявіла намесніца міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч на круглым стале «Заканадаўства аб СМІ як фактар развіцця нацыянальнай інфармацыйнай прасторы», што прайшоў 4 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы з удзелам прадстаўнікоў лукашэнкаўскага і недзяржаўнага медыясектару. У такім духу ішла гаворка на гэтай сустрэчы — адным з рэдкіх спатканняў лукашэнкаўцаў з прадстаўнікамі незалежнага грамадства.

Павел Якубовіч, галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия» і адначасова новапрызначаны кіраўнік Грамадскай каардынацыйнай рады па СМІ, выступіў з рэзкай крытыкай незалежных СМІ за тое, што яны не даюць працілеглага пункту гледжання, і абвінавачаў апазіцыйных палітыкаў, што тыя, змагаючыся за ўладу, выкапалі прорву між адным СМІ і другімі.

Намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч патлумачыла адмову «Белпошты» і «Белсаюздруку» распаўсюджваць шэраг выданняў эканамічнымі прычынамі.

У сваю чаргу старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна, яе намеснік Андрэй Бастунец, намесніца рэдактаркі газеты «Белорусы и рынок» Ірына Крыловіч і эксперт АБСЕ з Расіі Андрэй Рыхтэр крытыкавалі новы Закон пра СМІ (Рыхтэр) і сыпалі фактамі, што сведчаць пра манапалізацыю рынку СМІ і эканамічную дыскрымінацыю незалежных газетаў (Крыловіч, Літвіна).

Выступалі таксама кіраўнік Першага каналу ТВ Аляксандр Зімоўскі, рэдактар «Рэспублікі» і па сумяшчальніцтве старшыня лукашэнкаўскага Саюзу журналістаў Анатоль Лемяшонак, сацыёлаг з БДУ Давыд Ротман. Апошні прывёў звесткі, што ўжо 16—19% насельніцтва карыстаюцца інтэрнэтам як крыніцай інфармацыі.

Што датычыць замежных дыпламатаў, то як шанаванага госця прымалі пасла АБСЕ Ганса-Ёгана Шміта. Яго пасадзілі на пачэснае месца. Леваруч яго сядзела спн. Пяткевіч, праваруч — міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч.

У сваім вітальным слове пасол Шміт выказаў гаспадарам сустрэчы — Міністэрству інфармацыі і Беларускаму саюзу журналістаў — многа словаў падзякі за тое, што з іхняй дапамогай СМІ развіваюцца.

Зусім у іншай танальнасці выступаў намеснік кіраўніка дэлегацыі Еўракамісіі ў Беларусі (г.зн. прадстаўніцтва ЕС) Яніс Айзсалніекс. Ён падрабязна спыніўся на ўсіх праблемах і двайных стандартах у сферы СМІ ў Беларусі, вітаў вяртанне «Народнай волі» і «Нашай Нівы» ў распаўсюд, але адзначыў, што Беларусь яшчэ толькі ў самым пачатку доўгае дарогі да свабоды слова.

Ягоны выступ выклікаў жывую рэакцыю П.Якубовіча, які паспяшаўся нагадаць, што на радзіме дыпламата неграў лінчуюць, г.зн. неграмадзяне не маюць праву. «У нас таксама можна крытыкаваць Абаму!» — так і лез у галаву стары анекдот.

Стваралася ўражанне, што для прадстаўнікоў дзяржаўнага боку задачай дыялогу была контрпрапаганда ў прысутнасці заходняга боку.

Асертыўны выступ Жанны Літвіной вывеў з раўнавагі ўжо Наталлю Пяткевіч. Зайгралі па твары яе вытанчаныя рукі з фартэпіяннымі пальцамі, аздобленымі маляванымі на белае,

**Працяг на старонцы 7.**



# Маёру Кісялю далі наганяй

7 лютага прысягу таксама прынялі ў Баранавічах лідэр «Моладзі БНФ» Франак Вячорка і ў Жодзіне сябар «Маладога фронту» Зміцер Хведарук **(на фота)**.

Адразу пасля прысягі Франака перанакіравалі ў Мазыр для службы ў ваеннай часты № 48694 супрацьпаветранай абароны. У Баранавічах ён быў толькі ў вучэбцы.

З Хведаруком жа яшчэ напярэдадні прысягі адбыўся выпадак, які атрымаў шырокі розгалас.

5 лютага медычны работнік часткі маёр Уладзімір Кісель адмовіўся зрабіць агляд Змітру Хведаруку. У вульгарнай форме ён параіў хлопцу «не вы...цца», паабяцаўшы яго прыняць толькі пасля таго, як Зміцер пяройдзе на расійскую мову.

Таксама Кісель папрасіў іншых прызыўнікоў павучыць Хведарука, каб той зразумеў пра наступствы ягонага карыстання беларускай мовай. Гэты інцыдэнт выйшаў за межы вайсковай часткі і быў шырока растыражаваны СМІ.

Ужо на наступны дзень маёру Кісялю далі наганяй па поўнай праграме. Камандзір часткі паказваў медработніку Канстытуцыю і тлумачыў, што беларуская мова з'яўляецца першай дзяржаўнай у краіне і ёй нельга грэбаваць.

Нампаліт часткі таксама падыходзіў да Змітра і папрасіў яго ў будучыні не замоўчваць падобныя выпадкі, а расказваць.

Маёру Кісялю прапаноўвалі напісаць рапарт аб звальненні, цяпер яго пераводзяць у іншую частку.

Відаць, што адразу па прызыве ў вайсковыя часткі паступіў загад, каб з палітпрызыўнікоў не зваліўся нават волас.

ЗП

# Навагрудак дагэтуль без «Еўропы»

**Райцэнтр марыць пра аднаўленне якаснага гатэлю для прываблівання турыстаў, але праект зацягваецца.**

У чэрвені 2007 году на вуліцы Замкавай у Навагрудку быў знесены трохпавярховы будынак XVIII ст., былы гатэль «Еўропа». Годам раней у мясцовага прадпрымальніка яго выкупіла мінскае навукова-вытворчае аб'яднанне «Эльвіра». Новы ўласнік вырашыў аднавіць камяніцу ў колішнім выглядзе. Планавалася, што будынак будзе выконваць ранейшыя функцыі, то бок гэта будзе гатэль. Аднак, хоць у пашпарце аб'екту і значылася, што праца над новым гатэлем будзе скончаная ў 2008 годзе, з лета 2007 году тут амаль нічога не змянілася.

Дырэктар «Эльвіры» Аляксандр Поткін, адказны за рэканструкцыю, патлумачыў, што дазвол на пачатак працаў быў атрыманы толькі ў студзені гэтага году. «Працаваць пачнем у сакавіку, як пацяплее», — дадаў ён. З яго словаў, «Эльвіра» сутыкнулася са шматлікімі праблемамі — дагэтуль распрацоўвалася, удакладнялася і ўзгаднялася праектная дакументацыя, вырашаліся пытанні камунікацый у прылеглым да будучага аб'екту квартале гораду.

На паперы застаецца і амбіцыйны план гарадскіх уладаў збудаваць у сталіцы ВКЛ лядовы палац на 800 месцаў. Летась пра гэта заявіў намеснік старшыні Навагрудскага райвыканкаму Юры Калановіч. Падрадчыкам мела выступіць Упраўленне капітальнага будаўніцтва Гродзенскага аблвыканкаму. Справа пакуль завісла на стадыі распрацоўкі праекту ды выбару пляцоўкі.



**Так мае выглядаць квартал з «Еўропай».**

Сёлета Навагрудак адсвяткуе сваё 965-годдзе. Дзеля гэтага ўлады гораду перанеслі на год традыцыйны фестываль сярэднявечнай культуры «Навагрудскі замак». Нагадаем, што ад 2000-га году фэст ладзіцца раз на два гады.

СП

# Нягледзячы ні на што

**Незалежная рэгіянальная газета «Борисовские новости» знайшла друкарню і працягвае выходзіць.**

У снежні 2005 г. недзяржаўная грамадска-палітычная газета «Борисовские новости» з іншымі недзяржаўнымі выданнямі была пазбаўленая магчымасці распаўсюджвацца праз «Белпошту» і «Белсаюздрук». Сітуацыя дагэтуль не выправілася. У «Мінаблсаюздрук» звярталіся ўжо 6 разоў і ўсё безвынікова. Колькі гадоў таму рэдактар газеты Анатоль Букас **(на фота)** судзіўся з «Белпоштай». Усё марна.

Праз праблемы з распаўсюдам скараціўся і наклад выдання. Цяпер ён складае 6500 асобнікаў.

Напрыканцы мінулага году Барысаўскі райвыканкам скасаваў ліцэнзію на раздробны гандаль перыядычнымі выданнямі ў прыватнага унітарнага прадпрыемства «Букас медыа-цэнтр», які выдае «Борисовские новости». Выдавец барысаўскай газеты не пагадзіўся з дзеяннямі мясцовых уладаў і звярнуўся ў Гаспадарчы суд Мінскай вобласці з патрабаваннем адмяніць рашэнне выканкаму аб ануляванні гандлёвай ліцэнзіі. Калі Гаспадарчы суд пакіне рашэнне папярэдняй судовай інстанцыі ў сіле, то рэдакцыя газеты страціць больш за 100 мільёнаў рублёў. А гэта фактычна азначае банкруцтва прадпрыемства і страту працы для супрацоўнікаў рэдакцыі, зазначыў сп. Букас.

Новая праблема напаткала ў пачатку году. Спаслаўшыся на эканамічныя праблемы, прыватная друкарня «Плутас-Маркет» 9 студзеня скасавала дамову з рэдакцыяй на друк. «Наша газета выходзіць ужо 17 гадоў, гэта найстарэйшы штотыднёвік краіны. І за гэты час мы заўсёды знаходзілі спосаб, каб дайсці да чытача», — кажа сп. Анатоль Букас. З яго словаў, рэдакцыя і ў гэтай складанай сітуацыі знайшла выйсце, і газета працягвае друкавацца.

**Сямён Печанко**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## СЦІСЛА

### Хай пасядзіць

Экс-пракурору Міншчыны Міхаілу Снегіру канчатковае абвінавачанне яшчэ не прад'яўлена. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў начальнік упраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генпракуратуры Аляксандр Ракевіч. Пры гэтым Снягір працягвае заставацца ў следчым ізалятары.

### Канец яшчэ адной савецкай завядзёнкі

Спрошчаны парадак наведвання памежных зонаў, а самі яны істотна ўрэзаны. Ранейшы парадак вызначаўся яшчэ савецкімі нормамі, у выніку чаго больш як чвэрць тэрыторыі краіны лічылася памежнай зонай. У выніку таго, што закон быў дурным, яго ніхто не выконваў. Паводле новых нормаў, для ўезду ў памежную зону досыць пасведчання асобы і аплаты дзяржаўнай пошліны. Сама зона скарачаецца з 50 км да 10—15 км.

### Едзь на ўсе чатыры стараны

Генпракуратура закрыла дзве крымінальныя справы ў дачыненні да старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі. Гэтыя справы валачыліся на ім ад 2001 году — нібыта ён зняважыў Лукашэнку. Зараз Лябедзька зможа бесперашкодна выязджаць за мяжу.

# Аўрааму Лінкальну — чалавеку і аўтамабілю

Да 200-годдзя з дня нараджэння 16 прэзідэнта ЗША. Піша **Віталь Тарас**.

## Dream car

Імя «Лінкольн» (менавіта так, з націскам на о) у маім дзяцінстве звязвалася, найперш, з маркай аўтамабіля, а не з прэзідэнтам ЗША, у гонар якога была названая серыя машын класу «люкс».

«Лінкольн Зефір Кантыненталь»— адна назва чаго каштуе! — я бачыў, вядома, толькі на малюнку. Адзін з сяброў майго дзядзькі калекцыянаваў выявы аўтамбіляў, якія перадымаў з амерыканскіх часопісаў, завезеных у Савецкі Саюз кантрабандай. Фатаграфіі шыкоўных амерыканскіх машынаў 1940—1950-х (dream cars) зрабілі на мяне незабыўнае ўражанне. Датуль адзіная машына, якую давялося бачыць і на якой нават удалося пракаціцца, быў «Масквіч» першага выпуску. Пра яго склалі ў народзе вершык: «Стары хрыч купіў «Масквіч», урэзаўся ў цягача — не засталося ні хрыча».

Аўтамабілі Lincoln у мінулым стагоддзі былі сярод самых прэстыжных у ЗША. Кампанію Lincoln Motor Company заснаваў у 1917 годзе ў Дэтройце легендарны Генры Ліланд, які перад тым заснаваў кампанію «Кадылак», што выпускала авіярухавікі. Ліланд назваў сваю аўтамабільную кампанію ў гонар прэзідэнта Аўраама Лінкальна.

У 1922-м Ліланд быў вымушаны прадаць кампанію Генры Форду. Першая мадэль маркі *Lincoln L* мела 8-цыліндравы рухавік і каштавала 5000 даляраў. Мадэль *Lincoln Continental*, якая пачала выпускацца ў 1955 годзе, каштавала ўжо 10 000 даляраў — прыкладна столькі, колькі славуты «Ролс-Ройс».

У 1939-м кампанія «Лінкальн» зрабіла першы ў гісторыі прэзідэнцкі лімузін — адмыслова для Франкліна Рузвельта. Пасля яго на «Лінкальнах» ездзілі прэзідэнты Трумэн і Эйзенхаўэр. Аўтамабілю *Lincoln Continental convertible* наканавана было назаўсёды ўвайсці ў гісторыю разам з прэзідэнтам Кенэдзі — у гэтым аўтамабілі яго застрэлілі 22 лістапада 1963 году. Есць, безумоўна, злая іронія ў тым, што Джон Кенэдзі загінуў у аўтамашыне імя Аўраама Лінкальна — першага з амерыканскіх прэзідэнтаў, якія сталі ахвярамі замахаў на забойства. Ён быў забіты стрэлам у галаву 14 красавіка 1865 году.

У 21-м стагоддзі амерыканскія прэзідэнты будуць карыстацца лімузінамі фірмы «Кадылак». Апошняя мадэль з такіх бранаваных «Кадылакаў» упершыню была прадэманстраваная падчас інаўгурацыі Барака Абамы і атрымала назву Beast. Лічыцца, што дзякуючы новым тэхналогіям прэзідэнцкі аўтамабіль можа вытрымаць стрэл з гранатамёта і хімічную атаку.

Між іншага, прэзідэнт РБ карыстаецца «Мерсэдэсам». А вось ягоная ахова ездзіць на амерыканскіх «Крайслерах». Праўда, купленыя яны былі да сучаснага крызісу...

## Сумленны Эйб

Прэзідэнт ЗША Аўраам Лінкальн нарадзіўся 12 лютага 1809 году. Акурат за 190 гадоў да гэтага галандскі карабель упершыню прывёз у брытанскую калонію ў Паўночнай Амерыцы рабоў з Афрыкі. Немагчыма ўявіць, як склалася б гісторыя ЗША, калі б не гэты факт.

Лінкальну ў гэтай гісторыі належыць гонар палітыка, які скасаваў рабства ў Амерыцы.

Ён нарадзіўся ў сям'і непісьменных фермераў, продкі якіх прыехалі з Англіі. Лінкальн вучыўся саматугам. Ён на памяць ведаў многія тэксты Бібліі, якія нярэдка з бляскам выкарыстоўваў у сваіх прамовах.

Падобна Леніну, у маладосці Лінкальн зарабляў на жыццё адвакацкай практыкай. Пры гэтым адмаўляўся браць ганарары з бедных кліентаў і заўсёды своечасова вяртаў пазыкі. За што заслужыў мянушку Сумленны Эйб. Ён быў, як кажуць амерыканцы, «сэлфмэйдмен» — чалавек, які сам сябе зрабіў. І гэта імпанавала выбарцам.

У юнацтве Лінкальн ваяваў у Ілінойсе з індзейцамі, якія не хацелі пакідаць свае родныя мясціны, атрымаў званне капітана. Яму, як і абсалютнай большасці амерыканцаў, нават да галавы не прыходзіла, што ў індзейцаў таксама могуць быць нейкія правы.

Рэспубліканская партыя, ад якой



Лінкальн балатаваўся ў Сенат, а потым у прэзідэнты, выступала супраць рабаўладання. Але ж, выступаючы супраць рабства, палітык не лічыў, што неграм патрэбныя палітычныя і грамадзянскія правы. Ён выступаў толькі супраць распаўсюджання рабства ў паўночных штатах, бо гэта тармазіла развіццё эканомікі.

Перамога Лінкальна на выбарах у 1860 годзе раскалола краіну, хоць новы прэзідэнт і заявіў, што ён не збіраецца ўмешвацца ў справы рабаўладальніцкіх паўднёвых штатаў. У 1861 годзе пачалася Грамадзянская вайна. У 1865 яна скончылася паразай Поўдня, які выступаў за канфедэрацыю. Перамаглі федэралы Поўначы на чале з Лінкальнам.

Падчас вайны ён прыйшоў да разумення, што ЗША альбо стануць цалкам свабоднымі, альбо застануцца рабаўладальніцкай, адсталай і слабой краінай. У 1862-м ён напісаў «Пракламацыю аб вызваленні рабоў». Яна стала потым асновай 13-й папраўкі да Канстытуцыі, якая цалкам скасавала рабства ў ЗША. Папраўка пра свабоду слова была першай...

## Не народ для ўраду...

У 1863 годзе, на адкрыцці нацыянальнага мемарыялу на месцы пахавання ўдзельнікаў Гетысбергскай бітвы, Лінкальн выступіў з найбольш вядомай сваёй прамовай. Тады ўпершыню прагучалі словы: «Мы павінны ўрачыста пастанавіць, што гэтыя смерці не будуць марнымі, і наш народ з благаслаўлення Бога атрымае новую крыніцу свабоды, і гэты *ўрад з народу, створаны народам і для народу*, не памрэ на зямлі».

У ЗША ў апошнія гады пішуць і гавораць не толькі пра гераічны бок вайны. З абодвух бакоў тады загінулі больш за 600 тысяч чалавек. Многія дзеянні афіцэраў і жаўнераў у дачыненні да мірнага насельніцтва сёння назвалі б не інакш як вайсковымі злачынствамі.

Тым не менш, Лінкальн абвясціў амністыю для ўсіх канфедэратаў, за выключэннем галоўных кіраўнікоў.

У той самы час, у выніку здушэння паўстання Каліноўскага 1863—1964 гадоў, паводле прыблізных звестак, загінулі звыш 30 тысяч паўстанцаў. 148 чалавек былі павешаныя за ўдзел у паўстанні, звыш 12 тысяч — сасланыя ў Сібір. Царскі генерал-губернатар Мураўёў-Вешальнік увёў забарону на выкарыстанне лацінскага шрыфту і на друкаваныя тэксты па-беларуску.

Ліквідацыя прыгоннага права ў Расіі зацягнулася ажно да сярэдзіны XX стагоддзя, калі сялянам у СССР нарэшце пачалі даваць пашпарты. У выніку грамадзянскай вайны і калектывізацыі загінулі мільёны людзей. Мільёны працавалі на будоўлях камунізму на правах рабоў, ва ўмовах, якія нават у жудасным сне не сніліся героям Гарыет Бічэр-Стоў. (Дарэчы, яе раман «Хаціна дзядзькі Тома» дагэтуль забаронены ў некаторых штатах, паколькі неграў у ім называюць неграмі, а не «афраамерыканцамі»).

У год нараджэння Аўраама Лінкальна ў Англіі быў запатэнтаваны параход Фултана. Яшчэ ў маладосці Лінкальну давялося плаваць на колавых параходах па Місісіпі. Пры ім была пракладзена трансканТынентальная чыгунка, якая злучыла Усходняе і Заходняе ўзбярэжжы ЗША. Пры Лінкальне эканоміка Злучаных Штатаў стала развівацца дынамічна, што дазволіла краіне стаць у XX стагоддзі самай магутнай у свеце.

У 1860-я была закладзена сучасная банкаўская сістэма. (У 1866-м на 2-цэнтавай манеце ўпершыню з'явіўся надпіс In God We Trust, які стаў нацыянальным сімвалам ЗША. Гэтыя словы дагэтуль можна бачыць на даляравых банкнотах). Даляр сёння, вядома, не такі моцны, якім быў сто гадоў таму. Амерыканская фінансавая сістэма, як і капіталізм у цэлым, — не ідэальныя. Нішто не можа існаваць вечна, без зменаў.

Але нязменна захоўваюць свае значэнне, як ні дзіўна, самыя эфемерныя, нематэрыяльныя, на першы погляд, рэчы. Напрыклад — словы пра *ўрад, створаны народам і для народу*.

# У Беларусі таксама можна ганіць Абаму

**Працяг са старонкі 5.**

выштукаванымі пазногцямі. Да гонару Наталлі Пяткевіч, у выступе ў адказ яна стрымала сябе і «абсалютна пагадзілася» з думкай кіраўніка Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанны Літвіной, што з боку мясцовых уладаў бывае залішні кантроль і завышаныя патрабаванні да СМІ, «якія вельмі цяжка пераадолець», а дзяржаўныя СМІ ўспрымаюцца імі «як камунальная ўласнасць». «З гэтым трэба змагацца, мы будзем з гэтым працаваць», — запэўніла яна.

Н.Пяткевіч таксама выказала думку аб неабходнасці самафінансавання дзяржаўных СМІ.

Усе адміністратыўныя праблемы яна тлумачыла перагібамі на месцах.

Выступае намесніца Макея ясна, гаворыць выразна, трымаецца нязмушана, шмат усміхаецца і нават смяецца.

Апранутая яна была ў строгі цёмны штанны касцюм.

«Пляцоўкай дыялогу», на якім так настойвае Еўропа, была канферэнц-зала Нацыянальнай бібліятэкі з яе еўрапеоднымі інтэр'ерамі. Столь час ад часу скаланалі гурбы, што падалі з плоскасцяў «алмазу» пасля начнога снегападу. Сустрэчу знімалі ўсе тры лукашэнкаўскія тэлеканалы. Відэаапаратару незалежнага агенцтва БелаПАН у прысутнасці было адмоўлена.

Рэдактары незалежных выданняў пакідалі круглы стол без ілюзій.

**Мікола Бугай**

# Рэкордная інфляцыя

У Беларусі ў студзені 2009 г. спажывецкія цэны выраслі на 4,1% пасля росту на 1,2% за снежань 2008 г.



Гэтыя звесткі Белстату выклікалі шок. Такі ўзровень студзеньскай інфляцыі з'яўляецца абсалютным рэкордам са студзеня 2003 г. Мінэканомікі чакала інфляцыю ў студзені ў межах 3,5%. Зацверджаны прагноз на 2009 год прадугледжвае абмежаванне росту спажывецкіх цэнаў у рамках 9—11%. Між тым, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР) прагназуе значнае падзенне тэмпаў росту ВУП Беларусі ў 2009 годзе і рост інфляцыі ў раёне 15%.

**Радыё «Свабода»**

# Лукашэнка: Прамыслоўцам хацелася б яшчэ на 20% дэвальваваць рубель

«Прамыслоўцам хацелася б яшчэ на 20% дэвальваваць рубель. Але мы народу паабяцалі і будзем абяцанне трымаць. Таму хай шукаюць дадатковыя магчымасці для зніжэння сабекошту прадукцыі», — заявіў А.Лукашэнка, наведваючы ААТ «Лідсельмаш» на Гродзеншчыне.

# Чэмпіёнцы наківалі пальчыкам

за фотасесію ў стылі «ню».



Газета «Спортивная панорама» ў савецкіх традыцыях раскрытыкавала баскетбалістку Святлану Троіну. Прычынай стала тое, што зорка нацыянальнай зборнай распранулася перад фотакамерай. Сесія аўтарства мастачкі Таццяны Уласавай з'явілася ў газеце «Прессбол». Маральнаму абліччу Троінай была прысвечаная перадавіца «СП». Маўляў, пакуль адны «выкладаюцца на спрынтэрскай дыстанцыі», а другія «рызыкуюць жыццём, выконваючы найскладнейшыя піруэты», трэція «дэманструюць на ўсю краіну свае вабноты». Між тым, Троіна можа пахваліцца не толькі вабнотамі: яна бронзавая прызёрка чэмпіянату Еўропы і ўдзельніца Алімпіяды ў Пекіне. Сама Таццяна прызнавалася ў інтэрв'ю, што на такую фотасесію пагадзілася не дзеля грошай, а каб... палепшыць настрой.

**СМ**



ВОЛЬНЫ ЧАС

# Экскурсія на Дзень закаханых

13—15 лютага, у гонар Дня святога Валянціна, у Літаратурным музеі Янкі Купалы праводзяцца экскурсіі для закаханых. 13 лютага ў 17.00 адбудзецца вечарына для закаханых. Выканаўца — выдатны беларускі кампазітар, бард Алесь Камоцкі. Будуць гучаць аўтарскія песні, песні на словы Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, галоўная тэма якіх — Каханне.

Даведкі праз тэл. 227-78-66.

**Валянцінкі па-беларуску**

Адкрыўся сайт «Паштоўка» , на якім кожны можа замовіць валянцінку на беларускай мове. Можна ці замовіць паштоўку, а потым забраць яе ў адмысловым месцы, ці, пазначыўшы паштовы адрас, замовіць ананімнае прызнанне каханаму. Адрас сайту просты: pashtouka.org

**АКім**

# Пагоня ў георгіеўскіх стужках

У Віцебскім аблвыканкаме прайшло абмеркаванне праекту абласнога гербу. Абмяркоўвалі геральдычныя пытанні не абы-хто, а прадстаўнікі рады ветэранаў, БРСМ, абласной рады прафсаюзаў ды арганізацыі «Белая Русь».

Што на гербе будзе коннік Пагоні — ужо вырашана, так што абмяркоўваліся нюансы. Напрыклад, аблямоўка шчыта: ці туды перанесці дубовае галлё з губернскага гербу 1856 году, ці дамаляваць снапы лёну. Думалі і якой стужкай абвіць гэтую расліннасць. На губернскім гербе яна блакітная, дык вось ветэраны прапанавалі — георгіеўскай.



**Герб Віцебскага ваяводства ў 1500 г. Без імперскай «шапкі».**



**Герб Віцебскай губерні 1856 г.**

Таксама пакуль не вызначыліся, ці пакідаць над Пагоняй імперскую карону, ці стылізаваць яе пад нейкую вежу. Крыж Ефрасінні Полацкай на шчыце, адзіны «негубернскі кандыдат», — таксама пад знакам пытання.

А тым часам над «удасканаленнем візуальнага ўспрымання» Пагоні завіхаюцца на кафедры дызайну Віцебскага дзяржаўнага і тэхналагічнага універсітэтаў.

**Cz**

СЦІСЛА

### Пра калодзежную вадзіцу лепш забыцца

Хто з нас не любіць напіцца з бабінага калодзежа? А вось трэба адвучвацца ад гэтай звычкі. Няма таго, што раньш было: напрыклад, больш чым у палове калодзежаў Брэстчыны вада кепская. Яна не адпавядае санітарным нормам па хімічных паказчыках. Найчасцей назіраецца перавышэнне ўтрымання ў вадзе нітратаў. Гэта стала вынікам масавага ўжывання азотных угнаенняў, якія павышаюць ураджайнасць.

У кожным шостым калодзежы вада не адпавядае стандартам і па мікрабіялогіі. У калодзежы трапляе кішэчная палачка.

Такі ўзровень забуруджанасці трымаецца ўсе апошнія гады.

Добрую ваду цяпер можна браць толькі з артэзіянскіх свідравін, глыбіня якіх складае ад 150 да 600 метраў.

### У Сцяпянцы затрымалі 80 цыганоў

Міліцыя мае намер раздушыць злачыннасць у цыганскім асяродку. Супрацоўнікі міліцыі Партызанскага раёну Мінску затрымалі больш за 80 цыганоў у мікраёне Сцяпянка — месцы пражывання вялікае цыганскае грамады. У міліцыі ў іх узялі адбіткі пальцаў. Кожнага здымалі на відэакамеру для архіву. Кіраўнік міліцыі раёну кажа: «Прыходзіць да мяне адзін з залатымі ланцугамі і пытаецца: «За што затрымалі маіх дзяцей?» Я пытаюся: «Дзе працуеш?» Кажа: «Нідзе». Пытаюся: «Дзе дзеці працуюць?» Кажа: «Нідзе». «За кошт чаго жывяце?» Кажа: «Хусткі на базары прадаем». Ну, я ж разумею, што прадаваць хусткі і хадзіць у золаце... Ёсць пытанні».

Цыганы ж абвінавачваюць міліцэйскае кіраўніцтва ў самавольстве і парушэнні дзейнага заканадаўства.

**МБ; паводле БелаПАН, радыё «Свабода»**

# Ці змагаўся хтосьці за Беларусь?

Новую кніжку Алега Латышонка можна назваць малым зборам твораў — сюды ўвайшла ў перакладзе з польскай манаграфія «Беларускія вайсковыя фармаванні: 1917—1923 гады», а таксама згрупаваныя ў тэматычныя раздзелы «Станіслаў Булак-Балаховіч: старонкі бурлівага жыцця» і «Змаганне за ўласную дзяржаву» публікацыі аўтара з іншых выданняў. Такім чынам, гэта кніга пра шчырыя памкненні, палітычныя камбінацыі і асабістыя ахвяры.

## Вельмі асабістая кніга

Разам з тым кніга беластоцкага гісторыка, пры ўсёй напоўненасці яе фактурай і архіўнымі спасылкамі, нясе на сабе адбітак асабістых эмоцый аўтара. І пачынаюцца яны ад бацькі. Так, распавядаць Алегу Латышонку — ён сам пра гэта піша — пра вялікую гісторыю Беларусі пачаў ягоны бацька. А той усё не верыў: «Я прачытаў мноства кніжак, але ні ў адной нічога падобнага немагчыма было знайсці. Кніжкі, вядома, былі камуністычныя, і ўся гісторыя Беларусі з іх была выдаленая, таму можна мяне лічыць ахвярай прапаганды». Дадамо да гэтага ўласцівую маладосці ўзбунтаванасць супраць бацькавага аўтарытэту.

Якая перакуленасць шаляў! У позняй БССР хутчэй дзеці — вучні старэйшых класаў ды студэнты — маглі распавесці бацькам пра гісторыю Беларусі, чым пачуць ад іх уцямныя не толькі звесткі, але і сістэмныя думкі пра лёс іхняга краю, якія хоць бы трохі вылучаліся з савецкіх канонаў. Хіба што ўраджэнцы Заходняй Беларусі яшчэ маглі сутыкнуцца з напаўнастальгічнымі ўспамінамі сваіх бацькоў пра даваенны час. Гэта праўда — у савецкім ідэалагічным маналіце рэальнага месца для Беларусі не заставалася, а паміж пакаленнямі беларусаў узводзіліся муры забыцця і непаразумення.

Сам жа Латышонак звярнуўся да гісторыі Беларусі ўжо студэнтам Ягелонскага універсітэту ў Кракаве. Несумненна, гэта было для яго адкрыццём цэлага культурнага кантыненту, ці, як у Мар'яна Брандыса, «Каралеўства Беларусь».



**Латышонак, Алег. Жаўнеры БНР.** — Беласток: Беларускае Гістарычнае Таварыства; Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2009. — 366 с.



**Алег Латышонак прамаўляе падчас адкрыцця надмагільнага помніка Алеся Гаруна на Ракавіцкіх могілках у Кракаве. 1988 г.**

Найперш малады гісторык пачаў займацца постаццю генерала Булак-Балаховіча, а пасля, «разам з тым, як стаў сабе ўсведамляць, колькі людзей сапраўды ваявала за Беларусь, стала ясна, што напісанне біяграфіі Генерала давядзецца адкласці (усё маю надзею, што калісьці яе напішу)». Такім чынам нарадзілася доктарская праца (кандыдацкая, паводле постсавецкай тэрміналогіі) «Беларускія вайсковыя фармаванні: 1917—1923 гады».

## Беластаччане

Яшчэ адзін асабісты матыў Латышонка ў напісанні гэтай кнігі — удзел у баях за Беларусь ягоных землякоў, жыхароў Беластоцкага краю. Для самога аўтара тут вельмі паказальны прыклад Беластоцкага батальёну Дзямідава, які найдаўжэй з усіх беларускіх аддзелаў змагаўся з бальшавікамі ў адкрытым полі. На гэтым эпізодзе варта крыху спыніцца.

Увосень 1920 году да арміі Булак-Балаховіча далучыўся капітан Мікола Дзямідаў, які ў наваколлях Беластоку набраў з добраахвотнікаў батальён — чатырыста чалавек, — з якім і з'явіўся ў стаўку генерала пад Туравам. На пачатку лістапада армія Булак-Балаховіча рушыла на ўсход і ўзяла Мазыр. Але далейшы наступ быў спынены на Дняпры. Нашмат мацнейшыя чырвоныя дывізіі сталі адціснуць балахоўцаў на ўсход. 27 лістапада Булак-Балаховічу пагражала нават акружэнне. Тады выратавалі яго жаўнеры Беластоцкага батальёну і Смаленскага палка, якія ў вырашальны момант пераправіліся праз Прыпяць у вельмі цяжкіх абставінах і дапамаглі таварышам.

Пасля адступлення арміі Булак-Балаховіча на кантраляваную палякамі тэрыторыю Дзямідаў не здаўся, і са сваім батальёнам з 400—600 чалавек, з дзвюма гарматамі і чатырма кулямётамі, застаўся ў нейтральнай зоне і працягваў барацьбу. 29 лістапада батальён Дзямідава ўступіў у пераможны бой з бальшавіцкім 40-м стралковым палком, страціўшы чатырох забітых і 10 параненых. 3 снежня батальён адбіў атакі бальшавікоў пад вёскай Вялікая Малышаўка. Батальён якраз ішоў на дапамогу Слуцкай брыгадзе. На жаль, Рада Случчыны вырашыла спыніць змаганне і, ратуючыся ад бальшавікоў, перайшла на польскі бок фронту. Батальён жа Дзямідава апераваў на Мазыршчыне да студзеня 1921 году, пакуль нарэшце таксама не быў вымушаны перайсці на польскі бок.

**Беларускія вайсковыя фармаванні ў 1917—1923 гадах (без уліку партызанскіх) усе разам налічвалі каля 11 тысячаў байцоў.**

Асобны батальён пад камандаваннем Міколы Дзямідава быў апошнім беларускім вайсковым аддзелам, які на полі бою аказаў супраціў савецкім войскам у барацьбе за незалежнасць Беларусі. І тое, што гэта былі пераважна беластаччане, стала для Латышонка моцным пабуджальным матывам у даследаванні тэмы і напісанні працы.

Але вось сапраўдным адкрыццём (у тым ліку і для мяне) стаў радавод Дзямідава, распрацаваны Алегам Латышонкам. Мікола Дзямідаў (1888—1967) нарадзіўся ў Гарадку на Падляшшы, ён быў сынам Станіслава Катнароўскага і Аляксандры з Каліноўскіх. Ягоны бацька памёр у тым самым годзе, а маці паўторна выйшла замуж за акцызнага чыноўніка Івана Дзямідава, які 10 снежня 1889 году ўсыніў ейнага сына, даўшы яму сваё прозвішча.

Самі Дзямідавы былі мясцовымі фабрыкантамі, а адзін з іх фінансаваў рэстаўрацыю абраза Маці Божай у гарадоцкай царкве. У дзяцінстве ж на выхаванне Міколы найбольш уплыў меў ягоны дзед па маці Аляксандр Каліноўскі, брат (удакладню Латышонка — кузэн) Вінцэнта Канстанціна Каліноўскага, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гадоў у Літве і Беларусі. А ў шляхецкіх сем'ях гэта вельмі блізкая ступень сваяцтва. Так-так, Мікола Дзямідаў па кудзелі (па лініі маці) быў сваяком Кастуся Каліноўскага! Аляксандр Каліноўскі культываваў памяць пра свайго кузэна, што сапраўды паўплывала на будучы палітычны і нацыянальны выбар Міколы Дзямідава.

## Колькі іх было?

Усё ж, якія меркаванні Латышонка адносна колькасці беларускіх жаўнераў у час тых катаклізмаў? Па выніках сваіх архіўных штудыяў гісторык прыходзіць да высновы, што беларускія вайсковыя фармаванні ў 1917—1923 гадах усе разам налічвалі каля 11 тысячаў афіцэраў і жаўнераў (калі не браць пад увагу Беларускі корпус у Малдове на Румынскім фронце, які налічваў больш за 100 тысячаў чалавек).

Аднак трэба заўважыць, што некаторыя вайскоўцы па чарзе належалі да розных фармаванняў, ды не ўсе яны бралі ўдзел у баях. З іншага боку, за незалежнасць Беларусі змагаліся таксама партызаны, колькасць якіх вызначыць цяжка. Дзеля гэтага застаецца толькі прызнаць той факт, што за незалежнасць Беларусі ў той час са зброяй у руках змагаліся 10 з лішкам тысячаў чалавек. Колькасць не такая ўжо і вялікая, але гэта былі выключна добраахвотнікі.

Камандныя кадры беларускіх аддзелаў складалі інтэлігенты, якія пазнаёміліся з вайсковай справай на франтах Першай сусветнай вайны. Прафесійных вайскоўцаў сярод беларускіх камандзіраў было няшмат.

Працяг на старонцы 10.



**Гусары БНР перад будынкам вайсковай камендатуры Горадні вясной 1919 г.**

# Гісторыя аднаго размеркавання

Прыклад маладога настаўніка гісторыі сведчыць, што размеркаванне маладых спецыялістаў не заўсёды такое прыгожае, як на глянцавых старонках дзяржаўных газет. Свае два гады Павел адпрацаваў у адным з раёнаў на Міншчыне. Праз паўгоду пасля звальнення са школы сябры заўважылі яму, што той паспакайнеў, стаў лепей выглядаць.

### Суп у чайніку

Першыя месяцы працы па размеркаванні Павел, настаўнік гісторыі, пражыў у школьнай лабараторыі. Жытло, якое прапанавала школа, яго не задаволіла: аднапакаёўка ў старым калгасным дамку, у якую можна патрапіць па старой трухлявай лесвіцы, электраправодка адсутнічала. Акрамя таго, трэба было самому паклапаціцца пра запас паліва, якое не было дзе захоўваць — не было дрывотні. Спроба знайсці пакой у кагосьці з вяскоўцаў абярнулася няўдачай — ніхто з мясцовых не захацеў узяць да сябе «чужога», няхай сабе і настаўніка, які мусіў вучыць тутэйшых дзяцей. Таму і давялося пасяліцца ў лабараторыі кабінету фізікі.

З выгодаў — прыбіральня паверхам ніжэй ды электрычны чайнік, у якім гатаваў кіпень для гарбаты ды ролтанаў. Неяк на палявых працах настаўнікі з дзецьмі назбіралі грыбоў. «Вазьміце, суп які згатуеце», — прапанавала дырэктарка і тут жа аселася, узгадаўшы, што сама і дала ў арэнду свой чайнік.

Жыццё ў школе трымала ў сталай напружанасці. Уставаць трэба было рана, каб паспець падрыхтавацца да працы, паснедаць раней, чым прыедуць дзеці з навакольных вёсак. Вечарамі ў вокны школы зазіралі мясцовыя бэйбусы. Яны грукаліся ў дзверы, запрашалі выйсці паразмаўляць.



Добра жывецца ў нашым аграгарадку. Фота «Советской Белоруссии».

### Штодзённы марафон

Урэшце малады настаўнік знайшоў сабе жытло ў райцэнтры. Цяпер паўстала новая праблема — як дабірацца да працы. Да вёскі, дзе працаваў Павел, было каля дзесяці кіламетраў, аўтобусы туды хадзілі нерэгулярна. Пакуль не прыдбаў ровар, часцей хадзіў пешшу. Дырэктарка школы папрасіла свайго брата, дырэктара СВК, які жыў у гарадку, па магчымасці падвозіць на працу маладога спецыяліста. Той паабяцаў і нават колькі разоў тое абяцанне выканаў.

### Добраахвотна і з песняй

Цяжка здзівіць сучаснага беларускага настаўніка «добраахвотнай» падпіскай. У першы ж месяц маладому гісторыку прапанавалі выпісаць пакет выданняў, якія, са словаў адміністрацыі школы, мусілі дапамагчы яму ў навучальным працэсе. Настаўнік цягнуў да апошняга, выпісаў толькі самае неабходнае, і не прагадаў — цалкам падпіска каштавала ці не чвэрць ягонага першага заробку.

Сярод «добраахвотных» мерапрыемстваў Павел прыгадвае і шматлікія суботнікі, на якіх не толькі трэба было адпрацаваць ад званка да званка, але і пералічыць зробленыя грошы невядома куды.

У абавязкі настаўніка ўваходзілі абавязковыя візіты ў сем'і, што значыліся ў РАА ненадзейнымі. Неяк наведаліся да адной дзяўчынкі, каб пагутарыць з яе маці. Маці не было, школьніца са сваёй сяброўкай ужо падмалявалі вусны ды некага чакалі. Пад акном пасігналіў кіроўца, які прывёз настаўнікаў, дзявулі кінуліся паглядзець: «Коля прыехаў?! Не, не Коля». Дзеці з ненадзейных сем'яў хадзілі ў школу толькі для таго, каб пад'есці. Адзін хлапчук усю зіму прахадзіў у кедах. Але сучасная школа патанае ў бясконцых справаздачах, і за гэтымі паперамі дзяцей з іхнімі праблемамі часта не заўважаюць, кажа Павел.

### Дзяржава адбівае ахвоту працаваць па спецыяльнасці

Магчыма, камусьці выдаткі настаўніцкай працы, кшталту суботнікаў і падпіскі, пададуцца не вартымі ўвагі дробязямі. Але Павел без захаплення ўзгадвае рэгулярныя дзяжурствы на школьных вечарах, дзе адказнасць за нецвярозых школьнікаў нёс чамусьці ён, а не іхнія бацькі. Яму вельмі не спадабалася, што ў «Белую Русь» яго запісалі без ягонай згоды заднім датай.

Адпрацаваўшы два гады, ён і хвіліны не задумваўся, каб працягваць зарабляць на хлеб настаўніцтвам. Прынамсі, не ў найбліжэйшы час. Сёння ён працуе фасоўшчыкам лекавых прэпаратаў у адной са сталічных фірмаў і амаль ні пра што не шкадуе. Праз паўгоду пасля звальнення са школы сябры заўважылі Паўлу, што той паспакайнеў, стаў лепей выглядаць. Вядома — ад пачатку працы ў фірме заробак быў удвая большы, чым у школе, цяпер ён зарабляе яшчэ болей.

Дзяржава адбівае ахвоту працаваць па спецыяльнасці, мяркуе былы настаўнік. І справа не толькі ў тым, што маладым людзям пасля працы ў вёсцы няма дзе бавіць вольны час. Вельмі часта яго проста няма — справаздачнасць, напісанне планаў, паходы па сем'ях. Прыклад Літвы, дзе вясковым медыкам пачалі выдаваць службовае аўто, застаецца пакуль марай у нашых краях.

Праўда недзе пасярэдзіне, кажа Павел. Камусьці ж дастаецца і неблагое месца — і праца добрая, і жыллё ўтульнае. Але ягоны асабісты прыклад сведчыць, што размеркаванне маладых спецыялістаў не заўсёды такое прыгожае, як на глянцавых старонак дзяржаўных газет.

**Сямён Печанко**

# Ці змагаўся хтосьці за Беларусь?

Працяг са старонкі 9.

Жаўнерамі беларускіх фармаванняў былі амаль выключна сяляне, прычым несумненна багатыя і сярэдняй заможнасці, якія барацьбу за незалежнасць Беларусі атаясамлівалі з абаронай уласнай гаспадаркі.

### Пра сабаку Райта, альбо Як немагчыма ўхіліцца ад непрыемнага

Адну ж тэму Латышонак толькі пазначыў на ўступным «Слове да беларускага чытача», але не рызыкнуў развіваць. Тычыцца гэта супрацоўніцтва беларускіх дзеячаў з савецкімі спецслужбамі. Цяпер ужо відавочна, што некаторыя з найбольш выдатных змагароў (не гаворачы пра нашмат менш спраўных і адважных) за БНР, такія як Канстанцін Езавітаў, Францішак Кушаль ці Герман Шыманюк, сталі ў свой час савецкімі агентамі. Латышонак называе гэта вельмі прыкрай канстатацыяй і ўдакладняе, што падобная праблема «патрабуе шматбаковага і глыбокага вывучэння». Тым не менш, адзначае беластоцкі гісторык, відавочна таксама, што не былі яны агентамі ў той час, калі змаганне за незалежную БНР выглядала яшчэ рэальным.

Трагізм і злая іронія заключаецца ў тым, што менавіта многія беларускія «нацысты» да таго былі савецкімі агентамі. Стваральнік Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі Фабіян Акінчыц у 1920-я ўзначальваў Юрыдычны аддзел Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, а будучы прэзідэнт створанай пад немцамі ў 1943 г. Беларускай Цэнтральнай Рады Радаслаў Астроўскі таксама ж настолькі цесна супрацоўнічаў з мінскай КП(б)Б і Кампартыяй Заходняй Беларусі, што ўзначальваў Беларускі Кааператыўны Банк у Вільні, праз які праходзілі сродкі ГПУ (тагачасная назва КДБ) на фінансаванне Грамады. І ў нацызме, і ў камунізме яны бачылі шырму, за якой можна працягваць, у іхнім разуменні, беларускую справу.

> Малавядомыя факты: Радаслаў Астроўскі, Канстанцін Езавітаў і Францішак Кушаль былі ў свой час савецкімі агентамі.



Камандзір батальёну БНР Мікола Дзямідаў быў сваяком Кастуся Каліноўскага, што і паўплывала на ягоны выбар.

Мяне таксама не пакідаюць думкі, што можна рабіць у тыя хвіліны, калі абрынаецца ўвесь навакольны свет ды прыходзіцца акрэсліваць свой выбар «найменшага» з найгоршага. Усё ж я схіляюся да думкі, што лепш зусім нічога не рабіць, чым ісці на кампрамісы са злом у надзеі на ўласную гульню ды магчымы выйгрыш. Прынамсі, супрацоўніцтва беларускіх актывістаў са спецслужбамі таталітарных рэжымаў не дапамагло такім дзеячам рэалізаваць уласныя палітычныя мэты ды завяло іхняе ўласнае жыццё ў тупік.

Алег Латышонак таксама мае свой, не без сарказму, рэцэпт: «І, можа, лепш было б, каб Браніслаў Тарашкевіч займаўся літаратурнай дзейнасцю, замест таго, каб прадаваць свой народ Сталіну». Булак-Балаховіч у той самы час, у другой палове 1920-х, пісаў паэму пра свайго сабаку Райта.

**Алег Дзярновіч**

# Прыма Купалаўскага Ганна Хітрык абвясціла вайну папсе

«Людзі не дурныя, проста прывыклі», кажа яна.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

На Малой сцэне к/з «Мінск» адбыўся «Фестываль нікчэмнасцяў» — вясёлы капустнік, у якім бралі ўдзел маладыя акторы некалькіх мінскіх тэатраў. Тое, з чаго хочацца смяяцца, ды ўсё неяк ніхто не смяшыць — агрэсія папсы, спецыфіка беларускай моўнай і культурнай сітуацыі, — у «Фестывалі» было прэпараванае і прадстаўленае на публічны агляд. На сцэне танчылі робаты, поўзалі гаваркія чарвякі, адбываўся сеанс сувязі з імператарам Сусвету, ставіўся грандыёзны, супер-пупер, мюзікл з выпадковымі акторамі, і на прыдуркавата-аблегчанай версіі ангельскай мовы паказвалася казка «Царэўна-жабка».

З удзельніцай «Фестывалю», адной з арганізатараў імпрэзы, акторкаю Купалаўскага і салісткай гурту «Дзецідзяцей» Ганнай Хітрык гутарыць карэспандэнт «НН».

**«НН»: Ганна, Ваш капуснік так і просіцца, каб яго купіў які-небудзь тэлеканал, зрабіў з «Фестывалю нікчэмнасцяў» выдатную гумарыстычную перадачу...**

**Ганна Хітрык:** Баюся, што шмат хто, калі б убачыў такое па тэлебачанні, проста не скеміў бы, што гэта сцёб. На жаль, калі гаворка ідзе пра папсу, не ўсе разумеюць іронію. Калі я слухаю папсу па радыё, дык мяне бяруць смехі, а, скажам, таксоўшчыку побач няўцям, што тут такога камічнага. «Ты не похож на Гоголя и даже на Гюго». Людзі не дурныя, проста прывыклі. Бо творцы музыкі ўсё ўтрыравалі, утрыравалі і давялі да абсалютнай дурніны. А спявачцы ў сваю чаргу было ўсё адно, пра што яна будзе спяваць, яна была шчаслівая, што ёй даюць выйсці на сцэну.

**«НН»: Попс наступае?**

**ГХ:** Папса ўжо прашылася да нас. Праз тэлевізар, праз радыё, праз рынгтоны. Ты і не хочаш, а табе: «Паглядзі, паглядзі, паглядзі! На, на, на!» Спярша ты з ёй ваюеш: «Не хачу, не хачу, не хачу!» А яна гне на свой капыл: «Як табе гэта можа не спадабацца?! А ну паглядзі цяпер мой кліп 150 разоў!» Сілы няроўныя — мусіш скарыцца: «Ат, валяйце». Мы і хацелі паказаць гэты наступ у «Фестывалі нікчэмнасцяў». Менавіта пра гэта наша сцэнка «Шоу-балет «Мяса» [загадкавая шамаханская царыца-танцоўшчыца і два ампірныя янычары танчаць палка без сэнсу і ладу — кар.]. І двойчы на біс выходзім, хаця нас ніхто не запрашае. Нашыя сцэнкі з папсой не столькі камічныя, колькі пазнавальныя. Не здзіўлюся, калі нашую песню «На барбузінах» пра Наташку, якая сышла, можа ўзяць у ратацыю якая-небудзь FM-станцыя.

**«НН»: Можа, такая культурная сітуацыя склалася, і ўсё тут?**

**ГХ:** Ніякая гэта не сітуацыя! Усё ўпіраецца ў таго, хто вырашае, што круціць па радыё і тэвэ. Цяпер фармат такі: каб дайшло да самага дурнога. Каб, барані Божа, хто не дапяў бы. Нудзіць ад гэтага, такое ўражанне, што творцы перасталі думаць, выдумляць. Але ж я ведаю, у нашай краіне процьма таленавітых людзей: шмат гуртоў, якія граюць цікава, закранаюць нейкія стрункі тваёй душы. Але на скрыні па-ранейшаму — майка Gucci і кабрыялет. Нейкая дурнота засела, і ёй самой падабаецца, ці што... І ў «Фестывалі нікчэмнасцяў» мы намагаемся давесці, што так быць не павінна. Глядзіш — пачуўшы «хіты» нашага саматужнага гурту «Пігмаліёны», які чыноўнік і абурыцца: «Слухайце, такую ж лухту слухаюць мае дзеці! Трэба з гэтым нешта рабіць!» Або дыджэй, убачыўшы наша прадстаўленне, схопіцца за галаву: «О, Госпадзе, што ж стаўлю ў эфір!» Упэўненая — культура пераможа.

**«НН»: Расіяне, старанна вымаўляючы беларускае «дз» і запінаючыся на «ч», з камічнай сардэчнасцю дзеляцца з гледачом, як яны прыйшлі да беларушчыны і чаму захапляюцца ёй, — гэта сюжэт вашай сцэнкі «Клуб Sunshine». Што гэта, іронія?**

**ГХ:** Самаіронія. Трэба нешта рабіць і з беларускай культурай ды мовай. Усе сёння кажуць: «Мы — беларусы!», але сэнсам гэта не напаўняецца. Дык мы хоць так, іранічна, заявілі. Мы ж самі як мае быць па-беларуску не размаўляем. Немагчыма ж сказаць неўзвычаеным людзям: «А цяпер давайце ўсе будзем размаўляць па-беларуску». Але можна: «Сябры! Мы жывем так і так: беспрасвецціца. Думайце, рашайце самі, што далей». У сцэнцы, дзе казка «Царэўна-жабка» распавядаецца на спрошчанай ангельскай, а пры канцы Іван-царэвіч ад нястачы ангельскіх словаў пачынае праклінаць Кашчэя Неўміручага па-беларуску і той памірае ад сілы словаў, падкрэсліваецца, што ад ангельскіх жартаў мы смяемся, а беларускай не разумеем. Я, вядома, не месія. Як акторцы мне не хочацца, каб людзям пасля маіх выступаў было некамфортна. І чым выкрываць заганы наўпрост, дык мы з калегамі зрабілі, што ўмелі: вясёлае прадстаўленне.

**Гутарыў**
**Павал Касцюкевіч**

**Ганна Хітрык**

нар. у 1980. Адна з вядучых акторак Купалаўскага тэатру. Працуе ў тэатры з 2001 г. Сыграла шараг роляў у знакавых спектаклях («Паўлінка», «Ідылія», «Балада пра каханне», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Сымон–музыка»). Салістка папулярнага гурту «Дзецідзяцей».

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Хуткі Смоўж




Вясковы, БМА–груп, 2008

О! Беларусы дачакаліся сваіх «воплей» і «здобаў». Слаўгарадска-магілёўскі гурт на чале з цёзкам беларускага прэзідэнта ў дэбютным альбоме прадэманстраваў надзвычайную спеласць ды заявіў пра з'яўленне новага музычнага кірунку — «belarusian village-ska music». Такі дэбютны альбом маглі б запісаць «Песняры», калі б утварыліся ў нашы дні. З адчуваннем мелодыі ў Сяргея Лукашэнкі ўсё ў парадку, з харызмай, відаць, таксама. Засталося толькі мову падцягнуць, бо ягоныя стылізацыі пад народныя песні не заўжды пісьменныя ды часта поўняцца штампамі. Дзве самыя ўдалыя кампазіцыі альбому — на пачатку. Вядзецца ў іх пра праблемныя рэчы. Пра вёску, у якой ніколі не будзе вяселля ды пра хлапца, якому не памог доктар Хадоркін («Вёска», «Лебедзі»). «Хуткі смоўж» упаўзае ў лідэры айчыннага фолк-мадэрну.

Такі дэбютны альбом маглі б запісаць «Песняры», калі б утварыліся ў нашы дні.

**Сяргей Будкін**

# Нічога страшнейшага за рэалізм

На небасхіле расійскіх кінастужак, поўных гламуру, псеўдапатрыятызму і «чарнухі» нечакана ўспыхнула новая зорка — драма «Усе памруць, а я застануся» пра тое, як няпроста выбіваць сваё месца ў свеце аднагодак і старэйшых, калі табе 14. Рэжысёр, эксцэнтрычная Валерыя Гай Германіка 23-х гадоў, шакавала сваім з'яўленнем і кіношнікаў, і журналістаў, і абывацеляў, адвыклых ад вострых сюжэтаў кшталту «Розыгрышу». Услед за залатым словам «па пладах іх пазнаеце іх», праз цытаты аўтара паспрабуем адшукаць непарыўныя сувязі між рэжысёрам і фільмам. Каб зразумець, адкуль узяўся кінатвор, якому не так проста павесіць пэўны жанравы ярлык.



Валерыя Гай Германіка.

### «Здымаю фільмы пра падлеткаў, пра сябе і пра маленькую рэвалюцыю ўнутры чалавека»

Фільм атрымаўся пра дзяўчатак, якіх у школе звычайна менш за ўсё заўважаюць: яны нікога не прэсуюць, але пры гэтым не вучацца лепш за ўсіх. Тыповыя «сераднячкі» збіваюцца ў групкі, сяброўюць, жартуюць, сварацца з бацькамі, употайку кураць, падманам купляюць алкаголь і мараць пра першага хлопца.

Сама фільмовая гісторыя, хоць і дыспрапарцыйна напханая падзеямі, нейкай часткай знаёмая ўсім, хто скончыў школу не вельмі даўно. Прыплюсуем адсутнасць пэўнай высокай ідэі. Што атрымліваем? Абвінавачванні ў чарговых «чарнушных» здымках і пустым сюжэце. За што тады прэстыжныя кінаўзнагароды? Дарэчы, аўтар прынцыпова не адпраўляла фільм на расійскія кінафестывалі... Гэты паказ з экрану прымушае глядзець на сябе ж. На тое, кім быў, як неадэкватна паводзіўся, як марыў, што ўсе памруць, а я застануся... Узгадкі такога кшталту псіхіка часцей апускае ў падсвядомасць, каб чалавеку ніколі не думаць пра мінулую рэвалюцыю і толькі здрыгацца падчас соннага спаткання з падсвядомасцю ў абдымках Марфея. Фільм прымушае ўспомніць пра гэта. Шмат хто параўноўвае «Усе памруць...» з амерыканскім фільмам «Дзеткі», але гэтае параўнанне чыста вонкавае (і там, і там пра праблемы падлеткаў), бо апошні пафасна дэманструе, маўляў, так рабіць не трэба. Фільм Германікі нагадвае глыбокую рэфлексію на звычайныя сутычкі дзевяцікласніка ўнутры сябе і вакол сябе. Пры гэтым рэцэпту ад праблем рэжысёр не выпісвае...

### «Найлепшы расійскі фільм — «Бумер»

Нягледзячы на тое, што «Усе памруць...» сутнасна адрозніваецца ад усёй кіношнай крымінальшчыны а-ля «Брыгада» і стужак з бліскучым (ва ўсіх сэнсах) Гошам Куцэнкам, застаецца супольная рыса, а менавіта выкабеністае імкненне не выдаляць сцэнаў гвалту, не пераносіць іх на ўзровень сімвалічнага паказу, а неадменна кінуць у вочы, як пальчатку: «Глядзіце, а гэта нашае жыццё. Страшна? А то ж». Самая акцэнтовая сцэна згвалтавання выкрэслівае з мэтавай аўдыторыі саміх 14-гадовых гледачоў. Што ў сваю чаргу даказвае: гэты фільм бярэ куды шырэйшае праблемнае поле, чым адносіны падлеткаў. Гэта заклік больш для дарослых прызадумацца пра тое, што, напэўна, нешта ў нас ідзе не так. Бо ніводная праблема не жыве самастойна, яна вырастае з іншай.

«Мастацтва заўжды спекулявала на няшчасці людзей. Я не маю права на такое, трэба валіць у свет гульнявога кіно, каб не скурвіцца».

Спачатку Валерыя здымала дакументалістыку, але, стаміўшыся вырываць з людзей драму, вырашыла, што лепей прасіць прафесійных акцёраў падыграць гэтую драму. Уплыў дакументалістыкі адчуваецца ў працы камеры, што стварае эфект прысутнасці, у ігнараванні «адгладжанага» класічна-галівудскага мантажу, а самае галоўнае — у сюжэце. Трымаючы гледача цэлую гадзіну ў няспынным, імклівым, нарастаючым ходзе падзей, пасля кульмінацыі фільм раптам ставіць тлустую кропку. Як у дакументальным фільме: на гэтым усё, мы ж не ведаем, як складзецца ў героя далей... А шкада.

Ці рэжысёр не ведала, што дадаць, ці пазбягала маралізатарства, але ж смачны фінал застаўся няспраўджанай марай. За спінай таго, што маем: дзяўчынкі, што вытрымала столькі прыніжэнняў, выйшла з іх не пераможцай, але быццам бы не пераможанай. Свабода, новы дзень, паўстанне ці вяртанне — не хапіла якогасьці акорду, што надаў бы гісторыі форму завершанай сімфоніі. Канцоўка не дазволіла гледачу ўпэўніцца ні ў тым, што «ўсе памерлі», ні ў тым, што «я засталася».

### «Я ніколі не разумела Таркоўскага»

Кіно Германікі першапачаткова выключалася са спісу камерцыйных праектаў, але і андэграундным яго не назавеш. Асабістая цікавасць рэжысёра здымаць праблемы маладых шчаслiва супала з прадзюсерскімі шуканнямі новых талентаў. У выніку мінімальна апрацаваны сюжэт з жыцця, без аздаблення спецэфектамі ці трукамі, без удзелу знакамітых акцёраў, аказаўся ўжо ў камерцыйным плане паспяховым. Цалкам магчыма, што гэты сімбіёз урэшце ўмацуецца і прадставіць сабой новы кірунак ва ўсходнееўрапейскім кіно.



### «Няма нічога страшнейшага за сапраўдны рэалізм»

Гэта любімы выраз Валерыі ў Дастаеўскага.

Так, магчыма, яна перабольшыла з колькасцю калатнечаў, якія здарыліся з гераінямі. Так, нейкія рэакцыі і дзеянні ў фільме былі прыцягнутыя за вушы. Але варта прызнаць, знойдзеная тонкая пазіцыя балансу, кампраміс між гульнявым і дакументальным кіно. Пераломны перыяд падлеткавасці ў спальным маскоўскім раёне з вышыні росту, пакуль не надта вялікага, саміх дзевяцікласнікаў. Гэта як быццам аўтарам рубрыкі «Без каментароў» перад выпускам навінаў, якія не суправаджае карцінку вычарпальным тлумачэннем, але пры гэтым дакладна ведае, каго паказаць і колькі секунд.

У маўклівым, настойлівым люстэрку без віньетак і кветачак выяўляецца неэстэтычны, але і не найграна-брыдкі бок. Жорсткі, незваротны ход падзей, які рэжысёр, зусім як Дастаеўскі, не збіраецца выводзіць да хэпі-энду, а давядзе да катастрофы, з якой герою трэба будзе самастойна выбрацца. Хоць не Валерыі Германіцы належаць лаўры вынаходніцтва рэалізму ў кіно, яе вялізны плюс, што яна адзняла такі страшна рэалістычны фільм.

**Стася Мініч**




**Мастацкі фільм «Усе памруць, а я застануся». («Все умрут, а я останусь»).** Рэж. Валерыя Гай Германіка. Расія, 2008

Спецыяльны прыз Канскага кінафестывалю.

НОВЫЯ КНІГІ

## Электрастанцыя цяпла




**Алесь Аркуш, Барыс Козік. Брызгалаўка. Жодзінскія аповеды, успаміны і вершы.** Мінск: І.П. Логвінаў, 2009, 300 ас. 82с.

Успаміны дзяцінства: дзедава хата і бацькоўскія прысады... не, або так: чароўная сіметрыя двара і запаветныя аркі... Новая кніга Алеся Аркуша «Брызгалаўка» — не пра тое і не пра тое.

Прыгадваючы, Аркуш малюе трэцюю Беларусь, што прарасла бетонам проста пасярод палеткаў.

Глядзець, як азёры абразуюцца з торфакапальняў, вадаспады — з водаачышчальных канструкцыяў, а як краявід пачынаюць фармаваць не толькі блізкі ўзлесак, але і фабрычныя коміны. Назіраць, як на тваіх вачах, нібы ў лістоту, убіраецца ва ўласную гісторыю горад-саджанец. Як набывае свае легенды і цёмныя бакі. Жодзіна, Салігорск, Наваполацак.

Прачытаўшы жодзінскія аповеды, ловіш сябе на думцы, што суконныя скароты ДРЭС, ЦЭЦ, бы найсаладзейшыя сугуччы, пачынаюць лашчыць і тваё вуха. Выкшталцоны відавочца ўласнага дзяцінства Аркуш, без сумневу, мае адказ на пытанне, з чаго пачынаецца Жодзіна, яго Жодзіна.

Да ўласна Алесевых успамінаў далучаюцца прыгады яго бацькі, Барыса Козіка, пра вайну.

Кніга выйшла ў серыі «Кнігарня «Наша Ніва»». Разам з аркушоўскай «Брызгалаўкай» у серыі ўжо 31 папяровае выданне і 4 аўдыёкнігі — літаратура на самы розны густ.

**Лявон К.**

# Падтрымаем беларускага настаўніка

У перыяд калядных святкаванняў прадстаўнікі Таварыства беларускай школы ладзілі гасцявыя рэйды ў мінскія школы і садкі, у якіх вядзецца навучанне і выхаванне на беларускай мове. Асноўная мэта іх — маральная падтрымка педагогаў у іх нялёгкай справе, калядныя віншаванні, ганараванне дыпломамі ТБШ за прафесійнае майстэрства і выхаванне нацыянальнай свядомасці будучых актыўных грамадзян незалежнай Беларусі, уручэнне невялікіх падарункаў.

Да фармавання падарункаў далучыліся розныя грамадскія арганізацыі.

Цэнтр «Супольнасць» падараваў школам шматлікія метадычныя дапаможнікі, літаратуру па грамадзянскай адукацыі, а таксама запісаў адмысловы DVD дыск «Гадуем беларусаў», у які ўвайшлі сцэнары дзіцячых святаў, гульні, метадычныя матэрыялы па краязнаўстве і этнашколе, песенькі для маленькіх, аўдыёкнігі, казкі, чытанкі, мультфільмы, мастацкія фільмы і шмат чаго карыснага для настаўніцкай працы.

Грамадскае аб'яднанне «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» прэзентавала настаўнікам гістарычныя кнігі.

Аб'яднанне бацькоў з Беласточчыны «АБ-БА» падаравала кожнай школе беларускую азбуку — каляровы набор літар алфавіту, які стварыла выдатная беларуская настаўніца з Беластоку Аліна Ваўранюк.

Беларуская школка ў Нью-Йорку і культурна-адукацыйная фундацыя Орса-Рамана дапамаглі сфармаваць для кожнага беларускага садочка наборы дыскаў і касетаў з мультфільмамі, казкамі, песенькамі, а настаўнікам яны перадалі кнігі беларускіх класікаў: Янкі Купалы, Васіля Быкава, Ніла Гілевіча і іншых.

А кампанія «Будзьма!» дапамагла аздобіць падарункі адмысловымі торбачкамі, віншавальнымі паштоўкамі. Ад імя ТБШ педагогаў віншавалі Алесь Лозка, старшыня, і Тамара Мацкевіч, намеснік старшыні грамадскага аб'яднання.

Нягледзячы на перадкалядныя турботы, а таксама бясконцыя рэформы, праверкі, бюракратычныя патрабаванні, школьныя і дашкольныя ўстановы з задавальненнем віталі гасцей з падарункамі і віншаваннямі. У **сярэдняй школе г.Мінску, №60** (К.Лібхнета, 82), дзе арганізавана навучанне па-беларуску ва ўсіх класах, гасцей весяліў традыцыйнымі песнямі калядны гурт школьнікаў з «зоркай» і «казой». Падарункі і дыпломы ТБШ атрымалі настаўнікі гісторыі **Людміла Крыловіч** і **Аксана Хахлова**, якія шмат намаганняў надаюць краязнаўчай працы.

Плённая размова адбылася ў сталічнай **гімназіі №14** (Васняцова, 10), дзе сёлета ў чатырох першых беларускіх класах навучаецца 84 вучні (дарэчы, падобны вялікі набор адбыўся яшчэ толькі ў гімназіі №4).

Дарэчы, у гімназіі №14 працуе знакамітая настаўніца хіміі **Тэрэса Іванаўна Мятліцкая**, якая сёлета па выніках усіх выпрабаванняў стала пераможцай конкурсу прафесійнага майстэрства «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі» ў намінацыі «Настаўнік».

Ганараванні ад ТБШ атрымалі **Марыя Гарохава**, намеснік дырэктара, **Дзмітрый Ровенскі**, кіраўнік узорнага фальклорнага ансамблю «Дударыкі», **Святлана Собаль**, загадчык бібліятэкі, **Наталля Шурдзякова**, кіраўнік метадычнага аб'яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

У **гімназіі №23**, што размясцілася на праспекце Незалежнасці, былі ганараваныя разам з дырэктарам **Нінай Нікіцінай** у асноўным выкладчыкі, якія развіваюць у дзяцей мастацкія здольнасці (спевы, танцы, выцінанка і г.д.). Гэта **Алена Тумілові**, **Вікторыя Бельчанка**, **Наталля Гамаюнава**, **Ірына Моніна**. Але настаўніцкі калектыў гімназіі унікальны. Тут працуюць выдатныя філолагі, лінгвісты, якія выкладаюць шведскую, кітайскую, польскую ды англійскую мовы па-беларуску.




**Калектыў садка №202 трымаецца роднай мовы.**







**Гімназія №23 — флагман беларускамоўнага навучання. На фота — намесніца дырэктаркі Галіна Полудзень.**

У **гімназіі №9 г. Мінска** ганараванне адбылося падчас педагагічнай нарады, на якой прысутнічалі ўсе настаўнікі. Дыпломы атрымалі філолагі **Марына Янчэўская**, **Інэса Андрыянава**, а таксама дырэктарка — **Ларыса Апалінская**.

Сёлета мінскай СШ №2 нададзены статус гімназіі (№28). Усе класы тут маюць беларускую мову навучання, гімназія спецыялізуецца на вывучэнні замежных моваў. Вялікая заслуга ў гэтым, безумоўна, былога дырэктара **Аляксандра Сядзякі** — намесніка старшыні ТБШ, выдатнага выкладчыка фізікі, які за свае педагагічныя, лінгвістычныя таленты і грамадзянскую працу атрымаў ад ураду Францыі ордэн Акадэмічных пальмаў. ТБШ узнагародзіла выкладчыкаў **гімназіі № 28 Таццяну Куракевіч** (пачатковыя класы), **Вольгу Грышкевіч**, **Наталлю Штанюк** і **Наталлю Дабравольскую** (беларуская мова).

У **гімназіі №4**, якой кіруе пераможца конкурсу ТБШ, лаўрэат звання «Беларускі настаўнік 2007 году» **Юры Бандарэнка**, сёлета адзначана праца выкладчыкаў **Алены Калтовіч** (беларуская мова), **Уладзіміра Дземідовіча** (гісторыя), **Кацярыны Богдан** (пачатковыя класы), **Ірыны Дземідовіч** (англійская мова), а таксама намеснікаў дырэктара **Наталлі Юшкевіч** і **Галіны Філіпёнак**.

**Дзіцячым садкам №187**, дзе гадуюцца 4 групы беларускамоўных дзетак, і **№534**, што мае аж 12 беларускіх груп, вельмі пашанцавала з загадчыкамі. Гэта адчуваецца адразу, калі ўваходзіш у дашкольныя ўстановы. Кіраўнікі іх — **Таццяна Юрчык** і **Ларыса Урулёва** — атрымалі дыпломы ТБШ не здарма. Пра такіх кажуць, што яны аддаюць працы ўсю душу. Загадчыкі здолелі не толькі знайсці найлепшых выхавацеляў для дзетак, зрабіць музеі, знайсці сучаснае абсталяванне, гульнёвыя сродкі, нават зрабіць жывы куточак з хамячком і чарапашкамі, але і пасяліць беларускі дух у свае садочкі. Дарэчы, самая вялікая ў рэспубліцы беларуская **ДДУ №534** размешчана ў адным мікраraёне з самай вялікай роднамоўнай **гімназіяй №4**. А вось з падобным суседствам садку №187 не пашанцавала, няма побач беларускай школкі. Шкада, што кіраўніцтва Савецкага РАА не валодае станоўчым педагагічным досведам у гэтай справе. Каб вырашыць праблему, не патрэбна шукаць дзяцей у адзін беларускамоўны першы клас рускай установы ў нясрыяльны перыяд нацыянальнага забвення, а зрабіць рашэнне — прымаць толькі ў першыя класы з беларускай моваій навучання хоць адной у СШ раёну.

Дыпломамі ТБШ таксама былі ўзнагароджаныя **Наталля Анішчук**, **Ларыса Баброва**, **Марына Салавей** (выхавацелі **ДДУ №187**), **Святлана Купрэйчык**, **Галіна Грыгор'ева**, **Аксана Шкрэдава**, **Галіна Кішкурна**, **Святлана Занімон** (выхавацелі **ДДУ №534**), **Ірына Юркевіч**, (загадчык **ДДУ №202**) і выхавацелі **Наталля Рак** і **Таццяна Тарлоўская**. Яшчэ два гады таму назад і **сад №202** лічыўся поўнасцю беларускім, а цяпер тут ужо толькі дзве групы, а наагул у сталіцы калісь было 170 беларускамоўных груп...

Са звальненнем з пасады сапраўднага лідэра ўстановы паступова забываецца слава раней прызнаных цэнтраў беларускасці — **ДДУ №367** (экс-загадчыца **Галіна Прыма**), **№314** (экс-загадчыца **Раіса Слясарчык**) і інш.

Поспехаў і надалей вам, сапраўдныя Настаўнікі, непахіснай веры ў светлую будучыню Беларусі.

**Тамара Мацкевіч, Алесь Лозка**



**Калядкі ў СШ №60.**

## ІМПРЭЗЫ

**Канферэнцыя ў гонар Эдварда Вайніловіча**

**14 лютага а 9-й у дольнай зале касцёла Св. Сымона і Алены** пачнецца беларуска-польская навуковая канферэнцыя «Эдвард Вайніловіч — зямянін, грамадзянін, каталік».

**Сустрэча з Някляевым**

**16 лютага на сядзібе ТБМ** адбудзецца сустрэча з паэтам Уладзімірам Някляевым. **Пачатак у 18.30.** Уваход вольны.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## КАНЦЭРТЫ

**Джаз**

**20 лютага а 19-й у Вялікай зале Філармоніі (пр.Незалежнасці, 50)** у межах «Джазавых вечароў» зайграе **Zbigniew Wegehaupt Quartet** (Польшча). Імпрэза пройдзе пры судзеянні Польскага інстытуту ў Мінску.

**Пятніца 13**

**13 лютага ў «Рэактары» (Харужай, 29)** — фэст «Пятніца 13» з удзелам метал-гуртоў: **Asguard**, **Nightside Glance**, **Weeping Twilight**, **Soulsides**, **The Dim Sun** і інш. **Пачатак а 18-й.**

**Neuro Dubel**

**16 лютага ў «Графіці» (зав.Калініна, 16) а 19-й** — канцэрт гурту Neuro Dubel.

**Тройца**

**17 лютага а 19-й на Малой сцэне Купалаўскага тэатру (Энгельса, 12)** зайграе этнатрыо «Тройца».

**Каложскае Дабравесце**

**18—21 лютага ў Гродне** адбудзецца фестываль праваслаўных песняспеваў «Каложскае Дабравесце». Пройдзе ён **у Новым замку.**

**Канцэрт памяці Курта Кабэйна**

**20 лютага ў «Рэактары»** — фестываль-трыб'ют NIRVANA, прысвечаны дню нараджэння Курта Кабэйна. Бяруць удзел **Zaniapad**, **«Мутнае Вока»**, **«Голая Манашка»**, **Determined**, **In Joy**, **LikBez**, **«Псіхоз»**.

**Пачатак у 17.30.**

## ВЫСТАВЫ

**Радзівілаўская мапа ў Гістарычным музеі**

**У Музеі гісторыі і культуры (Маркса, 12) да 1 сакавіка** працуе выстава «Дэманструецца ўпершыню», на якой паказаныя экспанаты з новых паступленняў у фонд музею: радзівілаўская мапа пачатку XVII стагоддзя, арнат з устаўкамі з слуцкага поясу XVIII ст., археалагічныя экспанаты, калекцыя нумізматыкі і сфрагістыкі…

**Ван Дэйк і яго эпоха**

**У Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі (Новы замак) да 28 лютага** працуе выстава «Ван Дэйк і яго эпоха».

**Цуд захаванага бацькоўства**

**У галерэі NOVA (Харужай, 16)** адкрылася выстава Данілы Парнюка «Са-тварэнне. Хроніка сямейнага жыцця». Выстава будзе доўжыцца **да 22 лютага штодзённа, акрамя аўторкаў, з 11-й да 18-й.**

**Адам Міцкевіч на паштоўках**

**У мінскім музеі вайны (Кастрычніцкі пляц) да 31 сакавіка** працуе выстава «Адам Міцкевіч на паштоўках канца XIX — пачатку XX ст.»

**Беларусь: 1915—1918**

**У Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны да 31 сакавіка** працуе выстава, прысвечаная Першай сусветнай вайне «Беларусь: 1915 — 1918 гг.»

**Савіцкі, Данцыг, Паплаўскі…**

**У Палацы мастацтва (Казлова, 3) да 15 лютага** працуе Першая рэспубліканская выстава «Традыцыя і сучаснасць». Экспануюцца творы Міхася Савіцкага, Мая Данцыга, Георгія Паплаўскага.

**Пульс планеты**

**У Мастацкім музеі (Леніна, 20) да 24 лютага** працуе выстава Аляксандра Кішчанкі «Пульс планеты».

**Ігар Сечынаў. Фота**

**Да 22 лютага ў «Свеце Фота» (Прытыцкага, 10)** працуе персанальная фотавыстава Ігара Сечынава.

**Чатырнаццаць гісторыяў**

**У фотагалерэі «ZHЯТА» (пр.Незалежнасці, 13) да 20 лютага** працуе фотавыстава ландшафтнага партрэту «ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ ГІСТОРЫЯЎ».



# Стары Ольса



PHOTO.BYMEDIA.NET

**14 лютага ў Вялікай залі КЗ «Мінск» адбудзецца прэзентацыя альбому «Старога Ольса» — «Дрыгула», выдадзенага па матывах «Полацкага сшытку».**

# Народжаны быць у дарозе

Гродзенскі бард і актор Віктар Шалкевіч адзначае 50-гадовы юбілей.

У творчым набытку Віктара Шалкевіча сем альбомаў, дзве ролі ў кіно, а ў гродзенскім тэатры лялек заўсёды поўна, калі там граюць «Тутэйшых» з ягоным удзелам. Аўтар вядомых ад Гродна да Магілёва «Таварыша Сапегі» ды «Каroткай гісторыі Беларусі» сумяшчае акторскую кар'еру з правядзеннем аўкцыёнаў, а таксама ладзіць забаўляльныя мерапрыемствы.

«Ёсць такая харошая легенда пра маё нараджэнне — цяжарная мною мама ў той вечар дапамагала бацьку і майму брату будаваць хлеў, секла трэскі», — прыгадвае Віктар Шалкевіч. Увечары прыйшоў час нараджаць, павезлі парадзіху ў мястэчка, але не давезлі — нарадзіўся Віктар на санях. «Гэта быў як знак, што ўсё жыццё праваду ў дарозе», — кажа творца і ў пацверджанне гэтых словаў дадае, што толькі што вярнуўся з Вільні. «Быў ранічай каля касцёлу Маці Божай Вастрабрамскай, знайшоў некалькі літоўскіх манетаў, а яшчэ птушка мне пляму на нагавіцы зрабіла — добрая прыкмета! Таму настрой у мяне добры», — смяецца Віктар.

15 лютага бард дасць у гонар свайго юбілею канцэрт у Мінску ў Палацы культуры прафсаюзаў.

Рэдакцыя «Нашай Нівы» далучаецца да віншаванняў юбіляру, зычыць моцнага здароўя і аптымізму!

**Сямён Печанко**

**15 лютага** а 19-й у Палацы прафсаюзаў пройдзе канцэрт Віктара Шалкевіча. 1 святкаванне яго 50-годдзя. Квіткі: 15—25 тыс. рублёў.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Падмена




(Changeling)
ЗША, 2008, каляровы і ч/б, 141 хв.
**Рэжысёр: Клінт Іствуд**
Ролі выконваюць: **Анджэліна Джолі, Джон Малкавіч, Майкл Келі**
Жанр: **драма**
Адзнака: **8 (з 10)**

Аднойчы гераіня вярнулася дадому і не знайшла там свайго сына. Праз колькі месяцаў паліцыя ўрачыста перадала маці знойдзенага хлопчыка. Але гэта было чужое дзіця. Спробы маці даведацца, што насамрэч сталася з яе сынам, прывядуць да пераследу, псіхіятрычнай лякарні і сустрэчы з маньякам…

Гісторыя, расказаная Клінтам Іствудам, заснаваная на сапраўдных падзеях, што адбыліся ў 1920-я ў Лос-Анжэлесе. Сцэнарыст стужкі Майкл Стражынскі, які раней працаваў рэпарцёрам, наткнуўся на яе ў архівах. І не паверыў сваім вачам. Гісторыя нагадвала шокавы трылер, да якога не дадумаўся б аніякі драматург. Але сцэнарыст і рэжысёр зрабілі не легкадумную стужку, а пранізлівую і глыбокую драму.

«Пошукі праўды — аснова любога апавядання, — кажа Іствуд у адным з інтэрв'ю. — Казаць праўду — задача для сапраўднага актора, а барацьба за яе напаўняе сэнсам жыццё і кіно, фільм і рэальнасць».

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатр**
**20 (пт), 21 (сб), 22 (ндз)** — «Вяселле»
*малая сцэна*
**12 (чц), 13 (пт)** — «Апельсінавае віно»
**14 (сб)** — «Варшаўская мелодыя»
**15 (ндз), 16 (пн)** — «Дамскае танга»
**18 (ср)** — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»

**Тэатр беларускай драматургіі**
**12 (чц)** — «Любоўны дзённік»
**13 (пт)** — «Хто любіць мадам?»
**14 (сб)** — «Распуснік»

**Тэатр імя Горкага**
**14 (сб)** — «Каштанка»
**15 (ндз)** — «Сунічная паляна»

**ДК Данс**
**20 лютага пластычны тэатр «Інжэст» на сцэне Палацу культуры чыгуначнікаў (Чкалава, 7)** паказвае «ДК Данс». **Пачатак а 20-й**

**Ах, гэтыя свабодныя мятлікі!**
**13 лютага а 19-й на сцэне Палацу прафсаюзаў** — спектакль «Ах, гэтыя свабодныя мятлікі» Леанарда Герша, прасякнуты духам 1960-х. Жывая музыка, песні Джыма Морысана і Джэніс Джоплін.

# «Белсат»: тэлепраграма на 16–22 лютага
# «Белсат» – гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 16 лютага, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Ранча», серыял, 13 серыя
**19.00** «Расія, Чачня. Галасы іншадумцаў» (Voices of Dissent), дак. фільм, рэж. Карлё Нэра (Carlo Nero), 2005 г., Вялікая Брытанія
**19.50** Наша сцэна: канцэрт гурту «Крамбамбуля», ч. 2
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.20** «Без рэтушы»: «Атамны Астравец», 2009 г., Польшча
*Беларусь мае намер будаваць атамную электрастанцыю. У краіне, якая больш за іншых пацярпела ад найвялікшай ядравай катастрофы, гэтая тэма даволі гарачая. Нават выбар самога месца для АЭС выклікаў вострыя дыскусіі. Улады вырашылі збудаваць станцыю ў Астравецкім раёне, які лічыцца адным з найчысцейшых у Беларусі. На месцы ўжо паўстаў камітэт, што выступае супраць размяшчэння станцыі, хаця частка жыхароў, як падаюць медыі, вітае будаўніцтва АЭС, што дасць новыя працоўныя месцы.*
*У рэпартажы рэпрэзентуюцца меркаванні як жыхароў Астравецкага раёну, так і навукоўцаў-фізікаў, а таксама эколагаў і геолагаў.*
**21.50** «За жменю даляраў» (Per un pugno di dollari / A Fistful of Dollars), маст. фільм, рэж. Сэрджа Леонэ (Sergio Leone), 1964 г., Італія. У ролях: Клінт Іствуд (Clint Eastwood), Марыяна Кох (Marianne Koch)



**23.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 15 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 17 лютага, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 15 серыя
**18.50** Minsk-Mixt-2008, ч. 5. Канцэрт гурту :B:N:
**19.10** «Кропачка і Антон» (Punktchen und Anton), маст. фільм, рэж. Каралінэ Лінк (Caroline Link), 1999 г., Германія
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «Каталіцкі касцёл у Беларусі», дак. фільм, рэж. Зоф'я Кунэрт (Zofia Kunert), 2008 г., Польшча
**22.10** «Зберагчы спадчыну», рэпартаж, 2008 г.
**22.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 16 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 18 лютага, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 16 серыя
**18.55** Беларусы ў Польшчы
**19.10** «Рускае шчасце», дак. фільм, 1996 г., Беларусь
**20.05** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**21.45** «Невядомая Беларусь»: «Лінія Сталіна. Гонар ці ганьба?», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**22.20** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**22.35** Канцэрт Касі Камоцкай на XIV Фестывалі песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень—2007»
**23.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 8 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 19 лютага, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 8 серыя
**19.05** Кружэлка (сусветная музыка)
**19.40** Хто ёсць кім? Журналістка Ірына Халіп — мужнае сэрца
**19.55** «Справядлівасць паводле Пуціна», дак. фільм, 2006 г., Германія
**20.40** Кінастужка (праграма пра кінамастацтва)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»




**22.00** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.55** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 9 серыя
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 20 лютага, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 9 серыя
**19.15** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.45** «Смерць Джона Кенэдзі-малодшага», дак. фільм, 2007 г., Галандыя
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**21.35** «Тата» (Tato), маст. фільм, рэж. Мацей Лесіцкі (Maciej Lesicki), 1995 г., Польшча. У ролях: Багуслаў Лінда (Boguslaw Linda), Дарота Сэгда (Dorota Segda), Оля Малішэўска (Ola Maliszewska).



**23.25** «Пітбуль», серыял, 14 серыя
**00.10** Аб'ектыў (навіны)

### 21 лютага, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** «Слёзы Шахеразады» (Sheherazade's Tears), дак. фільм, рэж. Егуда Джад Нээман (Yehuda Judd Ne'eman), 2006 г., Ізраіль
*Гераіня фільму — украінка з Кіева, якая ўжо шмат гадоў жыве ў Ізраілі. Яна не габрэйка (выйшла замуж за грамадзяніна Ізраілю), але актыўна жыве жыццём краіны, у якую трапіла. Працуе ў ансамблі, у якім асноўная пара — араб і габрэйка. Мастацтва ратуе свет прыгажосцю...*




**20.00** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**20.30** Падземка (беларускі хіт-парад)




**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Маю права (прававаая праграма)
**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.00** «Інспектар-недарэка» (Inspecteur la Bavure), маст. фільм, рэж. Клод Зідзі (Claude Zidi), 1980 г., Францыя. У галоўнай ролі — Жэрар Дэпард'ё (Gerard Depardieu).
*Крымінальная камедыя. Малады паліцыянт-стажыст Мішэль Клеман нарадзіўся ў сям'і паліцыянтаў. Ягоны бацька прымушае сына паабяцаць, што той пойдзе шляхам бацькоў. Мішэль, вырашыўшы працягваць сямейную традыцыю, увесь час трапляе ў недарэчныя сітуацыі. Але ў складанай сітуацыі недарэка не губляецца і ўступае ў двубой са злачынцам...*
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 22 лютага, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял, 14 серыя
**19.10** Канцэрт Алеся Камоцкага і Андрэя Мельнікава на XIV Фестывалі песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень—2007»
**19.45** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**20.10** «1945: год, які змяніў свет» (1945: The Year that Changed the World), дак. фільм, рэж. Гэбі Кент (Gabi Kent), 2005 г., Вялікая Брытанія
*Расказваючы пра апошнія дні II сусветнай вайны, аўтары імкнуцца паказаць, што насамрэч адбывалася ў палітычных вярхах дзяржаваў-сатэлітаў: СССР, Вялікай Брытаніі ды ЗША. Паказваюцца матывы дзеянняў кіраўнікоў гэтых дзяржаваў і простых людзей. У фільме скарыстаныя рэдкія кадры з архіўных сховішчаў.*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Ток-шоу «Форум»: Сэксуалізацыя нашага побыту
*Адныя кажуць, што на беларускіх экранах паказваюць занадта шмат голых целаў і амаральных паводзінаў у штодзённым жыцці. Іншыя сцвярджаюць, што краіна над Нёмнам і Прыпяццю — пурытанская, дзе слова сэкс вымаўляюць шэптам, амаль як у СССР, дзе, як вядома, «сэксу не было».*



**22.05** «Інлэнд Імпаяр» (Inland Empire), маст. фільм, рэж. Дэйвід Лінч (David Lynch), 2006 г., ЗША—Францыя—Польшча. У ролях: Лора Дэрн (Laura Dern), Джэрэмі Айранз (Jeremy Irons), Джулія Орманд (Julia Ormond).
*Псіхалагічна-містычны трымценнік (трылер). Інлэнд Імпаяр — мясцовасць недалёка ад Галівуду, дзе ляжыць мястэчка, названае ў гонар багіні садоў Памоны. Тут разгортваецца таямнічая гісторыі пра жанчыну, якая трапляе ў небяспечную сітуацыю. Перад гледачамі паўстае класічны твор жанру, дзе ёсць і каханне, і містыка, і змаганне дабра са злом.*
**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)



ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Валютная выбранніца



**Для выратавання эканомікі краіны неабходна спыніць скупку даляраў і еўра насельніцтвам, цвердзяць чыноўнікі і банкіры. Цікава было б, каб да кампаніі падключыліся і айчынныя грошы. Фельетон Лёліка Ушкіна.**

— Не веру! Халтура!

Харэограф сцэны з балету Я.Глебава «Выбранніца», выяўленай на сторублёўцы, псіхаваў. Цяпер купюра, на якой працавала яго трупа, знаходзілася ў пенсіянеркі Н. Да моманту, калі старая пачыкільгае ў гастраном па хлеб, заставаліся лічаныя гадзіны. У момант разліку купюра мусіла вонкава адпавядаць усім патрабаванням Нацбанку. Аднак цяпер нічым падобным і не пахла: замест вядомай сцэны, дзе барадач у атачэнні балерынаў бадзёра падкідае гераіню, на банкноце назіраўся бардак. Артысты, спрабуючы настроіцца, вяла хадзілі па сцёртай паперцы туды-сюды.

У дадатак да хаосу, апісанага вышэй, на білет Нацбанку раптам вываліўся мужчына з кейсам, якога ў лібрэта яўна не было.

— Што робяць чужыя на купюры? — зароў харэограф.

Мужчына падышоў бліжэй: «Прабачце, вы рэжысёр сцэны з «Выбранніцы» на білеце Нацбанку нумар Гн9629787? Я ад Пракаповіча... Мы інфармуем усе білеты Нацбанку. Ёсць інструкцыя: перадухіляць валютна-абменныя аперацыі. Калі вашу купюру будуць мяняць на даляры — уцякайце са сцэны. Тады выява на банкноце не будзе адпавядаць вонкавым стандартам. Разумееце? Касір абменніка падумае, што яна фальшывая, і ўгода будзе сарваная».

У пастаноўшчыка, які даўно выношваў асабістыя творчыя планы, загарэліся вочы: «Нашто ўцякаць? Мы можам сцэну з аднаго майго спектаклю...»

«Не, — катэгарычна адрэзаў чыноўнік. У вас чалавечы калектыў, а на іншых купюрах будынкі і панарамы гарадоў. Адзіны спосаб змяніць выгляд такіх банкнот у выпадку іх абмену — частковы дэмантаж. Спецыяльныя брыгады ўжо закладаюць пад аб'екты дынаміт. Уяўляеце, што будзе, калі мы бабахнем «Летні амфітэатр ў Віцебску» з дзесяцітысячнай? Не дай Бог ваша купюра будзе побач... Усіх асколкамі накрые. На ўсякі выпадак дайце артыстам распісацца за тэхніку бяспекі.

Рэжысёр папоўз да артыстаў. А чыноўнік у душы добрым словам згадаў шалёную інфляцыю 1990-х, якая вынесла з рынку першыя «зайчыкі». На іх былі выяўленыя выключна жывёлы. Пры ўсёй фантазіі, ён не мог уявіць, якім чынам мог бы растлумачыць ласю з банкноты «50 капеек», што такое рэгіянальная рэзервовая валюта, даляр, еўра і выданне «Советская Белоруссия», прымусовая падпіска на якое свеціць парнакапытнаму, калі ён не падпарадкуецца інструкцыі.

Юбілеі святкуюць два мудрыя дзяды беларускай культуры.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Арсеню Лісу — 75

Гісторыку ідэй і культуры, доктару філалагічных навук Арсеню Лісу споўнілася 75. Ён нарадзіўся 4 лютага 1934 г. у вёсцы Вётхава ў Смаргонскім раёне.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэту, потым выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Шаркаўшчынскай сярэдняй школе на Віцебшчыне.

У 1966 г. выдаў кнігу пра напаўзабароненага на той час лідэра Грамады і аўтара беларускага правапісу Браніслава Тарашкевіча.

Пасля ён адкрыў чытачам Драздовіча, Гарэцкага.

Неўзабаве ў «Кнігарні «Наша Ніва» мае выйсці збор твораў Арсеня Ліса.

### Анатолю Грыцкевічу — 80

Патрыярху беларускай гістарычнай навукі споўнілася 80 гадоў. Нарадзіўся ён 31 студзеня 1929 г. у Мінску. Мае тры вышэйшыя адукацыі: скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моваў, Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1959 г. працуе ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук. Тэма, якой ахвяраваўся прафесар Грыцкевіч, — гісторыя беларускай урбаністыкі: гарады часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, іх характарыстыкі, магдэбургскае права ў Беларусі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Самага абаяльнага беларускага барда** з Горадні віншуем з юбілеем, 50-м годам жыцця! Чакаем сустрэчы 15 лютага на канцэрце

**Наталку і Ігара** сардэчна віншуем са шлюбам. Шчасця! Здароўя, любові ды згоды Вам. Данілюкі

**Зрабіў нас нязломнымі час,**
Напоўніў гарачым натхненнем,
Багата кахання ў нас,
Багата цудоўных імкненняў.
Сумелі мы так пасталець,
Што болей юнацтва з гадамі...
А чаркі стаяць на стале,
У размове забытыя намі...

Шаноўны Арсень Сяргеевіч! Сардэчна віншуем з юбілеем! Здароўя Вам ды шчасця, творчага натхнення на доўгія гады! Карына Кастаненка, Наталля Камілеўская

**Арсень Сяргеевіч Ліс,** даражэнькі, з юбілеем Вас! Моцнага здароўя і далейшых творчых поспехаў. Мы як раўняліся на Вас у нашых справах, так і надалей будзем раўняцца. Дзякуй, што Вы ёсць! Андрэй Вашкевіч

**Даражэнькі Арсень Сяргеевіч!** Спадар Арсень! Як добра, калі Вы ёсьць побач. І калі мы проста маўчым. Чуешся тады мацнейшым, разумнейшым і самае галоўнае — напаўняешся гонарам і годнасцю, што і ты БЕЛАРУС! Czarniakiewicz

**Шаноўны Арсень Сяргеевіч!** Жадаю Вам яшчэ доўгіх гадоў жыцця, каб дачакацца таго дня, калі ў цэнтры Менску замест бальшавіцкага Малоха ўстане помнік Тарашкевічу. З вялікай павагай, Сябры з Рыгі

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Цяпер у нас банкі даюць каля 6% у год, значыць, калі наш хутар каштуе 700 рублёў, дык трэба, каб ён даваў даходу свайму гаспадару 42 рублі. Значыць, арэнды за наш хутар болей як 42 рублі ў год плаціць не можна. Гэта самая вялікая цана, якую можна ўзяць за такі хутар. Ад даходу, што меў наш хутарнік (ад 74 руб. 66 кап.), адкінем грошы, што трэба плаціць за арэнду (42 руб.), дык выйдзе, што той, што сядзіць на ім, можа зарабіць у год чыстымі грашмі 32 рублі 66 кап.

**«Наша Ніва». № 6 і 7. 1909**




Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, аднаўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
заснавальнік Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.
Наклад 5450. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 10.02.2009.
Замова № 746.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISBN 1819-1614